Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
25 ЛЮТАГА 2016 г. ЧАЦВЕР № 36 (28146) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ліміт на грошы за мяжой**

СТАР. 4

Сямейная газета



**ІТ-адукацыя для дзяцей**



**Непрыдуманае каханне Шніпа і Рублеўскай**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Беларусі і ЕС цяпер трэба нагнаць упушчанае і актыўна пераходзіць да новых прыкладных формаў узаемадзеяння і праектаў з рэальным эканамічным эфектам. У сувязі з гэтым вельмі актуальным для нас з'яўляецца распаўсюджванне мандата Еўрапейскага інвестыцыйнага банка на нашу краіну. Мы, у сваю чаргу, гатовы прапрацаваць пералік прыярытэтных праектаў для напаўнення будучай стратэгіі работы банка ў Беларусі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21664,00 | ▲ |
| Еўра | 23834,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 283,52 | ▼ |
| Укр. грыўня | 796,47 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Інтэрн – работа адказная



Фота БЕЛТА.

З выпуску студэнтаў-медыкаў 2015 года да праходжання інтэрнатуры ў медустановах Брэсцкай вобласці прыступіў 401 спецыяліст. Гэтым маладым інтэрнам даверылі працаваць у аддзяленні для нованароджаных дзяцей абласнога радзільнага дома.

■ Добрая справа

## НА ЎЗРОЎНІ ЧАТЫРОХ «ЗОРАК»

**Нясвіжскі прадпрымальнік плануе адрадзіць гісторыю праз гасцініцу**

**Нясвіж адметны не толькі багатай гісторыяй, але і немагчымасцю аператыўна знайсці месца для пражывання. Пры тым, што амаль кожны трэці мясцовы жыхар здае жыллё для турыстаў на суткі. Запатрабавана ўсё: ад дзяржаўнай гасцініцы і замкавых пакояў да аграсядзіб і звычайных вясковых хат. Але сёлета на месцы былога ваенкамата ў горадзе з'явіцца яшчэ адзін гатэль, які мусіць стаць не проста месцам для пражывання, а сапраўдным культурным цэнтрам з экскурсійнымі маршрутамі, музычнымі вечарынамі і гістарычнымі атракцыёнамі для замежных турыстаў.**



**Дзмітрый МІРОН і Віталь КАРПАНАЎ у падвальным VIP-пакоі-схованцы.**

Ініцыятарам пераўтварэння будынка, створанага ў першай палове мінулага стагоддзя, у сучасны шматфункцыянальны комплекс стаў **прадпрымальнік Дзмітрый МІРОН.** У раёне ён вядомы як кіраўнік прыватнага прадпрыемства, якое займаецца вырабам і пастаўкамі карысных дабавак у кармы для жывёл. Мясцовыя характарызуюць яго як энтузіяста, няўрымслівага, шчырага і прагнага да працы. Дарэчы, менавіта з прыбытку ад работы завода і ўзяліся грошы на рэканструкцыю будынка ваенкамата.

СТАР. 5

■ Абітурыент-2016

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ЦТ,

**а ў сакавіку ў краіне стартуе трэці раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання**

**Стаў вядомы графік правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў 2016 годзе. Экзаменацыйная кампанія стартуе ў панядзелак 13 чэрвеня — у гэты дзень абітурыенты будуць здаваць на ЦТ беларускую мову.**

14 чэрвеня ў пункты правядзення цэнтралізаванага тэсціравання абітурыенты прыйдуць, каб прадэманстраваць экзаменатарам свае веды па рускай мове. Грамадазнаўства прэтэндэнты на студэнцкі білет будуць здаваць 16 чэрвеня, біялогію — 18-га, матэматыку — 19 чэрвеня, гісторыю Беларусі — 21-га.

Тэсціраванне па хіміі будзе праходзіць 23 чэрвеня, па фізіцы — 24-га. Сваё веданне замежных моў абітурыенты змогуць прадэманстраваць 25 чэрвеня. А на 27-га запланаваны тэсты адразу па дзвюх дысцыплінах — па сусветнай гісторыі найноўшага часу і геаграфіі (гэта адны з самых малакалькасных экзаменацыйных дысцыплін). Рэгістрацыя на ЦТ будзе доўжыцца з 2 мая па 1 чэрвеня.

Рэзервовы дзень для здачы ЦТ па-ранейшаму застаўся адзін, хоць прапаноўвалася прадугледзець некалькі рэзервовых дзён, каб у абітурыентаў, якія захварэлі падчас «асноўнай хвалі», была магчымасць дагнаць упушчанае, а ў выпускнікоў расійскіх школ, якія не паспяваюць у чэрвені прыехаць у Беларусь і здаць ЦТ з-за сваіх экзаменаў, быў шанц паўдзельнічаць у конкурсе на бюджэтныя месцы.

СТАР. 4

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

# АБ МЕРАХ ПА ПАВЫШЭННІ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА КОМПЛЕКСУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Галоўным прыярытэтам сацыяльна-эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца чалавек, падтрымка сям'і, дзяцей і старых. За гады незалежнасці краіны сфарміравана дзяржава для народа. Развіваецца адукацыя, ахова здароўя, інфраструктура, умацоўваецца нацыянальная бяспека.

Нарастанне негатыўных з'яў у сусветнай эканоміцы, скарачэнне попыту на нашых традыцыйных экспартных рынках, рэзкае падзенне цэн на нафту і сыравінныя тавары, геапалітычная нестабільнасць прывялі да пагаршэння ўмоў знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь.

У сучасных умовах знешнеэканамічных працэсаў і іх адмоўнага ўплыву на нацыянальную эканоміку неабходны своечасовыя меры па забеспячэнні **эканамічнай бяспекі, сацыяльнай стабільнасці** і фарміраванні дадатковых умоў для **аднаўлення ўстойлівага эканамічнага росту**. Рэалізацыя на практыцы ўнутраных рэзерваў развіцця патрабуе ініцыятыўнай і эфектыўнай работы кіраўнікоў прадпрыемстваў, прынцыпу вертыкалі ўлады рашучых і сістэмных мер.

У гэтых мэтах п а с т а н а ў л я ю:

**1. Павышэнне эфектыўнасці функцыянавання эканомікі:**

1.1. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

прыняць дадатковыя меры для забеспячэння:

прыбытковай працы дзяржаўных прадпрыемстваў пры належнай якасці кіравання іх актывамі і зніжэнні сабекошту прадукцыі не менш як на 25 працэнтаў;

павышэння плацежнай дысцыпліны ва ўзаемаразліках за пастаўленыя тавары, выкананыя работы, аказаныя паслугі;

развіцця добрасумленнай канкурэнцыі на ўнутраным рынку;

росту і дыверсіфікацыі экспарту;

рацыянальнага імпартазамяшчэння;

паскоранага развіцця малога і сярэдняга бізнесу і ўключэння яго ў экспартную дзейнасць і імпартазамяшчэнне;

прыцягнення замежнага капіталу ў развіццё і стварэнне вытворчасцяў;

эканоміі рэсурсаў арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці і павышэння якасці вырабленай прадукцыі (работ, паслуг);

сумесна з Нацыянальным банкам паступальнага зніжэння ставак па крэдытах у эканоміцы;

выпрацаваць прапановы па:

прыватызацыі (адчужэнні) аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці на прынцыпах празрыстасці, аператыўнасці і эфектыўнасці;

прымяненні спрошчаных працэдур фінансавага аздараўлення сельскагаспадарчых арганізацый;

1.2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму:

забяспечыць штогадовае павелічэнне колькасці працаўладкаваных грамадзян на наваствораныя працоўныя месцы за кошт стварэння новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў на 50 тыс. чалавек;

рэалізаваць імпартазамяшчальныя праекты з дасягненнем аб'ёму выручкі ад рэалізацыі прадукцыі не менш як 600 млн долараў ЗША штогод у прамысловай вытворчасці і сферы паслуг за кошт пазабюджэтных крыніц;

забяспечыць на працягу 2016 года скарачэнне пратэрмінаванай знешняй дэбіторскай запазычанасці на суму не менш за 100 млн долараў ЗША;

забяспечыць належную абарону ўнутранага рынку ад нядобрасумленнай канкурэнцыі, павысіўшы эфектыўнасць сістэмы антыманапольнага рэгулявання ў Рэспубліцы Беларусь;

актывізаваць інвестыцыйную дзейнасць, забяспечыць шырокі і спрошчаны доступ да крэдытных ліній Кітайскай Народнай Рэспублікі, якія выдзяляюцца на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў, усталяваўшы галіновыя прыярытэты іх выкарыстання. Актыўна прыцягваць прамыя замежныя інвестыцыі;

забяспечыць у 2016 годзе зніжэнне затрат арганізацый, якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, і своечасовае прыняцце рашэнняў па дасягненні ўзроўню іх пакрыцця тарыфамі для насельніцтва ў памеры 50 працэнтаў па ўсім комплексе названых паслуг. Дадатковыя даходы па сістэме Міністэрства энергетыкі ад зніжэння аб'ёмаў перакрыжаванага субсідзіравання накіраваць на зніжэнне тарыфаў на энергарэсурсы для прамысловых спажыўцоў у парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай акадэміі навук забяспечыць актыўнае ўкараненне айчынных тэхналогій у фармацэўтыку, аграпрамысловы комплекс, біятэхналагічную вытворчасць, галіны новых матэрыялаў і іншыя сектары вышэйшых тэхналагічных укладаў;

1.4. кіраўнікам дзяржаўных органаў:

забяспечыць аператыўны і ўсебаковы разгляд прапаноў прадпрымальнікаў па развіцці вытворчасцяў і стварэнні працоўных месцаў, аказваць ім усялякае садзейнічанне;

арганізаваць тлумачальную работу з насельніцтвам для папулярызацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, разняволення дзелавой ініцыятывы грамадзян;

1.5. ускласці на старшыняў раённых (гарадскіх) выканкамаў персанальную адказнасць за забеспячэнне эфектыўнай дзейнасці стратных сельскагаспадарчых арганізацый;

1.6. упаўнаважыць старшыняў раённых (гарадскіх) выканкамаў прымаць у парадку, які зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, аператыўныя рашэнні па перадачы ў давернае кіраванне прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў устойліва неплацежаздольных камунальных сельскагаспадарчых унітарных прадпрыемстваў, у тым ліку з правам далейшага набыцця такіх маёмасных комплексаў даверным кіраўніком, які належным чынам выканаў умовы дагавора давернага кіравання, а таксама па адабранні і выдзяленні зямельных участкаў, якія выкарыстоўваюцца такімі прадпрыемствамі (пры захаванні мэтавага прызначэння сельскагаспадарчых земляў і земляў ляснога фонду), даверным кіраўнікам і (або) эфектыўна працуючым суб'ектам гаспадарання (інвестарам) у вызначаным парадку;

1.7. устанавіць, што:

асноўным крытэрыем для аказання дзяржаўнай фінансавай падтрымкі суб'ектам гаспадарання з'яўляецца рэалізацыя імі ў межах дзяржаўных праграм інвестыцыйных праектаў, якія забяспечваюць павышэнне прыбытковасці вырабленых тавараў (работ, паслуг) і зніжэнне іх сабекошту;

экспартныя крэдыты выдзяляюцца адкрытым акцыянерным таварыствам «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» арганізацыям, якія не з'яўляюцца рэзідэнтамі, у парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

частка працэнтаў па крэдытах, што выдаюцца банкамі-нерэзідэнтамі крэдытаатрымальнікам-нерэзідэнтам для набыцця беларускіх тавараў (у тым ліку па лізінгавых схемах), кампенсуецца Рэспублікай Беларусь у 2016 — 2017 гадах за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных на адпаведныя мэты;

пачатковы кошт продажу прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў, акцый (доляў у статутных фондах) гаспадарчых таварыстваў, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай і камунальнай уласнасці, вызначаецца па рынкавым кошце ў парадку, які ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**2. Збалансаванае выкананне бюджэту 2016 года і меры сацыяльнай абароны насельніцтва, дадатковай падтрымкі маламаёмных, уключаючы асоб пенсійнага ўзросту, і іншых сацыяльна неабароненых катэгорый грамадзян:**

2.1. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму:

рэалізаваць кампенсавальныя меры падатковай палітыкі, накіраваныя на аднаўленне даходаў бюджэту і зніжэнне іх залежнасці ад кан'юнктуры знешняга попыту на сыравінныя тавары;

сфарміраваць у 2016 годзе рэзервы ў рэспубліканскім бюджэце ў памеры да 8 трлн рублёў для аказання мер сацыяльнай падтрымкі асобным катэгорыям насельніцтва, у мясцовых бюджэтах — да 2,8 трлн рублёў для фінансавання выдаткаў на выдзяленне безнаяўных жыллёвых субсідый за кошт эканоміі ў выніку зніжэння бюджэтнага субсідзіравання жыллёва-камунальных паслуг;

прыняць вычарпальныя меры па:

мінімізацыі негатыўных наступстваў, абумоўленых ростам цэн на спажывецкія тавары ў выніку прымянення мер бюджэтнай кансалідацыі. Пры гэтым прырост індэкса спажывецкіх цэн ад названых мер не павінен перавышаць 3,7 працэнта;

аптымізацыі і скарачэнні выдаткаў кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь на 2016 год, перш за ўсё за кошт памяншэння выдаткаў на:

непершачарговыя капітальныя ўкладанні (набыццё абсталявання і іншых асноўных сродкаў, капітальнае будаўніцтва, рэканструкцыя і капітальны рамонт);

утрыманне органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовага кіравання і самакіравання за кошт аптымізацыі функцый і колькасці дзяржаўных органаў усіх узроўняў. Сродкі ад гэтай аптымізацыі накіроўваюцца на павышэнне заработнай платы дзяржаўных служачых;

пакрыццё (кампенсацыю) працэнтаў па крэдытах у беларускіх рублях, якія выдадзены альбо выдаюцца ў рамках дзяржаўных праграм і мерапрыемстваў (за выключэннем крэдытаў на жыллёвае будаўніцтва), павялічыўшы стаўкі па крэдытных дагаворах на 2 працэнтныя пункты з адначасовым зніжэннем у такім жа памеры стаўкі пакрыцця (кампенсацыі) за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў працэнтаў па гэтых крэдытах;

датацыі, якія перадаюцца з рэспубліканскага бюджэту ў кансалідаваныя бюджэты абласцей і ў бюджэт г. Мінска;

2.2. кіраўнікам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, старшыням аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама забяспечыць першачарговае зніжэнне затрат на закупку імпартнай сыравіны (матэрыялаў, камплектуючых), скарачэнне выдаткаў на ўтрыманне адміністрацыйна-кіраўніцкага апарату, адмову ад доўгатэрміновых капітальных укладанняў у невытворчую сферу (у тым ліку за кошт валютных крыніц);

2.3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь для забеспячэння сацыяльнай абароны насельніцтва, дадатковай падтрымкі маламаёмных, уключаючы асоб пенсійнага ўзросту, і іншых сацыяльна неабароненых катэгорый грамадзян унесці прапановы па:

павелічэнні з 1 сакавіка 2016 г. бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва;

узмацненні з 1 сакавіка 2016 г. механізмаў дзяржаўнай адраснай сацыяльнай падтрымкі грамадзян, у тым ліку шляхам перагляду памераў выплат сацыяльнага характару;

укараненні з 1 кастрычніка 2016 г. безнаяўных жыллёвых субсідый для частковай аплаты асноўных жыллёва-камунальных паслуг;

2.4. Саветам дэпутатаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў разгледзець магчымасць аказання за кошт адпаведных мясцовых бюджэтаў дадатковай сацыяльнай падтрымкі дзецям, моладзі, ветэранам, інвалідам, пажылым людзям, а таксама іншым катэгорыям грамадзян, якія маюць патрэбу ў дапамозе.

**3. Забеспячэнне абслугоўвання і своечасовага пагашэння валютных абавязацельстваў:**

3.1. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнаму банку:

праводзіць збалансаваную макраэканамічную палітыку, накіраваную на нарошчванне дзяржаўных золатавалютных рэзерваў да эканамічна бяспечнага ўзроўню, які пакрывае трохмесячны імпарт тавараў (работ, паслуг), а таксама кароткатэрміновыя даўгавыя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь у замежнай валюце;

забяспечваць своечасовае і поўнае выкананне абавязацельстваў, у тым ліку праз рэфінансаванне, пад персанальную адказнасць:

Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь — па пагашэнні валютнага доўгу ўрадам і рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання;

старшыні праўлення Нацыянальнага банка — па пагашэнні валютных абавязацельстваў Нацыянальнага банка;

старшыняў аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама — па пагашэнні валютнага доўгу мясцовых органаў кіравання і самакіравання;

кіраўнікоў арганізацый і камерцыйных банкаў — па пагашэнні валютнага доўгу гэтых і падпарадкаваных ім арганізацый;

3.2. упаўнаважыць Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь на падпісанне міжурадавых і міжнародных дагавораў, накіраваных на прыцягненне інвестыцыйных рэсурсаў ад міжнародных фінансавых арганізацый, якія змяшчаюць палажэнні, адрозныя ад норм заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, з наступнай ратыфікацыяй такіх дагавораў у вызначаным парадку.

**4. Паўнамоцтвы і адказнасць кадраў:**

4.1. ацэнку эфектыўнасці работы кадраў ажыццяўляць па наступных асноўных крытэрыях:

Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і яго першага намесніка — па выніках забеспячэння макраэканамічнай стабільнасці і эфектыўнага кіравання валютным доўгам урада;

старшыні праўлення Нацыянальнага банка — па выніках забеспячэння фінансавай стабільнасці ў краіне, скарачэння валютных абавязацельстваў Нацыянальнага банка, нарошчвання міжнародных рэзервовых актываў Рэспублікі Беларусь;

намеснікаў Прэм'ер-міністра, міністра замежных спраў — па росце і дыверсіфікацыі экспарту;

кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання — па аб'ёме прыцягнутых прамых замежных інвестыцый у галіну, рацыянальным імпартазамяшчэнні;

старшыняў абласных, Мінскага гарадскога выканкамаў — па аб'ёме прыцягнутых прамых замежных інвестыцый у рэгіён, рацыянальным імпартазамяшчэнні, росце і дыверсіфікацыі экспарту, стварэнні новых працоўных месцаў;

старшыняў раённых (гарадскіх) выканкамаў — па колькасці створаных новых працоўных месцаў;

кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў — па паказчыку чыстага прыбытку і скарачэнні сабекошту тавараў (работ, паслуг), што вырабляюцца;

4.2. для павышэння аператыўнасці прымаемых рашэнняў, скарачэння тэрмінаў адміністрацыйных працэдур надзяліць паўнамоцтвамі Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь усталёўваць тэрміны ўзгаднення дзяржаўнымі органамі, у тым ліку падпарадкаванымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, праектаў заканадаўчых актаў па найважнейшых пытаннях дзяржаўнага рэгулявання ў эканамічнай сферы;

4.3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным сакратарыятам Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь да 1 чэрвеня 2016 г. унесці прапановы па:

скарачэнні залішніх і дублюючых функцый органаў дзяржаўнага кіравання, кантрольных (наглядных) і праваахоўных органаў;

удасканаленні сістэмы падбору і расстаноўкі кадраў, іх навучання і перападрыхтоўкі (у тым ліку за мяжой), павышэння матывацыі на дасягненне вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця;

удасканаленні парадку і ўмоў прызначэння (вызвалення ад займаемай пасады) кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый, а таксама арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і больш працэнтаў акцый (доляў у статутных фондах) належыць дзяржаве;

мінімізацыі наглядных праверак, скарачэнні наглядных органаў, падстаў для правядзення такіх праверак і павышэнні ролі пракуратуры ў забеспячэнні законнасці;

4.4. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь на працягу 2016 года забяспечыць:

перагляд паказчыкаў эфектыўнасці работы фіскальных органаў у частцы зрушэння акцэнтаў з бягучага напаўнення бюджэту суб'ектамі гаспадарання на стратэгічнае забеспячэнне іх стабільнай і бясстратнай работы;

карэкціроўку абавязковых да прымянення тэхнічных нарматыўных прававых актаў, прадугледзеўшы выключэнне з іх патрабаванняў і абавязкаў, якія непасрэдна не звязаны з бяспекай прадукцыі (работ, паслуг).

**5. Забеспячэнне недатыкальнасці ўласнасці:**

Генеральнай пракуратуры і судам забяспечваць безумоўнае і няўхільнае выкананне гарантый абароны ўласнасці, якая прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

6. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнаму сакратарыяту Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь, Камітэту дзяржаўнага кантролю, Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнаму банку, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Указам і прыняць іншыя захады па яго рэалізацыі.

7. Гэты ўказ уваходзіць у сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*23 лютага 2016 г. № 78*
*г. Мінск*

■ Меркаванні

# СТАЎКА НА АДКАЗНАСЦЬ

**Меры павышэння эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу, акрэсленыя ва Указе Прэзідэнта №78, сёння абмяркоўваюцца на ўсіх узроўнях. «Звязда» пацікавілася меркаваннямі прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса і бізнесу.**

**Уладзіслаў ЦЫДЗІК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па аграрнай палітыцы:**



— Гэта вельмі даступны дакумент, зразумелы не толькі кіраўнікам, але і звычайным грамадзянам. Дакладна распісана, хто і за што адказвае; рэкамендацыі даюць магчымасць убачыць, як нам выйсці з сённяшняй складанай эканамічнай сітуацыі, у якой мы апынуліся не па нашай віне. Указ прапісвае, што і як мы павінны рабіць. Напрыклад, тое ж зніжэнне сабекошту павінна праводзіцца як праз выключэнне безгаспадарчасці, так і праз укараненне новых тэхналогій.

У плане імпартазамяшчэння зроблена ўжо шмат, але спыняцца нельга, бо інакш «прарэхай» скарыстаюцца суседзі. Так ці інакш, імпартазамяшчэнне павінна праводзіцца разумна.

Вельмі правільная стратэгія падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу. У нас яго доля прыкладна 40%, у той час як у сусветнай практыцы, у еўрапейскіх краінах доля малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў эканоміцы краіны складае 75%. Улады не павінны чыніць перашкод для развіцця прадпрымальніцтва. На словах у нас, здавалася б, усё добра, але часта атрымліваецца сітуацыя, калі чалавек, задумаўшы адкрыць уласную справу, ледзь не год вымушаны збіраць нейкія даведкі. У выніку ідэя бізнесу перастае быць новай... Але ж жаданне чалавека займецца ўласную справу — гэта нармальная з'ява, і трэба гэтай з'яве садзейнічаць! Важна, каб мясцовыя ўлады сапраўды падтрымлівалі малы бізнес, тады дзяржаве будзе лягчэй. Можна вельмі шмат прыкладаў прывесці па раёнах, дзе малы і сярэдні бізнес стаў валаўтваральным.

Шмат увагі ў дакуменце надаецца і сельскай гаспадарцы, найважнейшаму — асабліва на працягу апошніх гадоў — сегменту экспарту нашай краіны.

Робіцца акцэнт і на неабходнасці зніжэння знешняй дэбіторскай запазычанасці — гэта вельмі прынцыпова, бо калі няма вяртання валютнай выручкі, то ад гэтага цярпяць і прадпрыемства, і яго калектыў, і дзяржава. Сёння трэба рашуча выступаць за вырашэнне гэтага пытання: выручка павінна своечасова прыходзіць, бо інакш прадпрыемства вымушана браць крэдыты, а гэта дрэнна.

Ва ўказе выразна распісана адказнасць за пагашэнне дзяржаўнага доўгу. Тут трэба яшчэ і дадаць, што ў прынцыпе наша краіна яшчэ ні разу не сарвала пагашэнне знешняга доўгу. Гэта прама ўплывае на імідж краіны, на тое, ці будуць нам давяраць і далей.

Увогуле, кожная пазіцыя ва ўказе з'яўляецца падказкай для выхаду са складанай эканамічнай сітуацыі. Трэба захаваць станоўчыя тэндэнцыі эканамічных працэсаў у нашай краіне, падтрымаць нашых грамадзян. Указ ставіць задачу штогод уладкоўваць на новыя працоўныя месцы 50 тысяч чалавек — а гэта адпавядае інтарэсам людзей. Яны ў нас вельмі свядомыя, і цяпер, калі ўступіў у сілу Дэкрэт «Аб прадухіленні сацыяльнага ўтрыманства», тыя, хто дагэтуль не меў пастаяннай працы, вельмі зацікаўленыя яе знайсці.

Такім чынам, калі будзе выконвацца кожны з пунктаў, прапісаных ва Указе, грамадства адчуе паляпшэнні ў эканоміцы.

**Анатоль ЖЫГАЛАЎ, генеральны дырэктар ЗАТ «Прамлізінг», член грамадскага савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Магілёўскім аблвыканкаме:**



— Я лічу, што адна з глабальных праблем, якая сёння перашкаджае эфектыўна працаваць, — адсутнасць адказнасці за тую работу, якую чалавек выконвае. Умоўна кажучы, трэба, каб кіроўца адказваў за машыну, слесар — за станок і гэтак далей. Гэта сёння не працуе. Адказнасць ускладаецца на кіраўніка або, больш дакладна, на наймальніка. Наймальнік адказвае за выкіданне смецця, арганізацыю работы, нават за бухгалтарскі ўлік. Трэба вызваліць дырэктара ад гэтых другасных функцый, каб ён змог засяродзіцца на галоўным — на эфектыўнай працы прадпрыемства. Як паказвае наш вопыт, людзі не здольны несці адказнасць за свае ўчынкі. Вось мы адправілі нашых дальнабойшчыкаў у Расію, а яны ніяк там не могуць адаптавацца. Лічаць, што ім нехта павінен запчасткі знайсці, аформіць за іх накладную, дарожны ліст...

Захады, якія агаворваюцца ва ўказе, сапраўды дзейсныя. Пра іх усе ведаюць, галоўнае — зрабіць так, каб яны працавалі. Сёння эфектыўнасць паказваюць толькі новыя сучасныя тэхналогіі. У Магілёве прадпрыемствы новага пакалення — «Кронаспан», «ВМГ Індустрыі» — працуюць зусім на іншых масавых тэхналогіях. Там выпрацоўка на аднаго чалавека складае больш за мільён долараў. У той час як на старых тэхналогіях — 60-100 тысяч рублёў на чалавека. Таму павінна працаваць сістэма заахвочванняў. Напрыклад, сёння выпрацоўка 60 тысяч рублёў на чалавека, а калі прадпрыемства павысіць яе да 80 тысяч, чаму б не вызваліць яго на суму гэтага прыросту ад падатку на прыбытак? Ён гэтыя грошы ўкладзе і заўтра зробіць 100 тысяч. Нам трэба такім жа чынам, як і ўвесь свет, стымуляваць эфектыўную вытворчасць за кошт змяншэння выдаткаў. Працуеш лепш — плаціш менш падаткаў. З адзінкі прадукцыі іх будзе менш, затое колькасць узрасце.

Тое, што мы мала працуем над імпартазамяшчэннем, відаць па нашых прылаўках. Там спрэс кітайскі тавар. Раней мы такое самі рабілі, чаму не вярнуцца да гэтага? Беларусь была зборачным цэхам, працавала на Савецкі Саюз. А цяпер мы працуем на сябе, і тыя магутнасці, што маем, не загружаны цалкам. Гэта добрая магчымасць для вытворчасці імпартазамяшчальнай прадукцыі.

Што датычыцца праверак, я цалкам згодны, што іх павінна быць менш. Санстанцыя, ратавальнікі, прафсаюзы, падатковая інспекцыя і гэтак далей — усе стаяць у чарзе, каб правяраць. Навошта, калі прадпрыемства працуе і выплачвае падаткі, перашкаджаць яму займацца сваёй непасрэднай справай і адцягваць увагу яго супрацоўнікаў на гэтыя праверкі?

**Сяргей АШМЯНЦАЎ, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў:**



— Указ Прэзідэнта краіны пачынаецца словамі аб тым, што галоўным прыярытэтам сацыяльна-эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца чалавек, падтрымка сям'і, дзяцей і старых. Другі раздзел дакумента цалкам прысвечаны сацыяльнай абароне насельніцтва, дадатковай падтрымцы малазабяспечаных і сацыяльна слабых катэгорый грамадзян.

Як вядома, з 1 сакавіка павялічваецца бюджэт пражытковага мінімуму, што пэўным чынам паспрые названай падтрымцы. Але і мы, абласны Савет дэпутатаў, і раённыя Саветы гатовыя разглядзець магчымасць аказаць за кошт мясцовых бюджэтаў дадатковую сацыяльную падтрымку дзецям, моладзі, ветэранам, пажылым людзям, а таксама іншым катэгорыям грамадзян, якія маюць патрэбу ў дапамозе. У найбліжэйшы час будзем сустракацца з кіраўнікамі выканаўчых органаў, шукаць фінансавыя рэзервы з тым, каб вынесці пытанні на разгляд сесій.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, Надзея ЮШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Тры пытанні да ўлады

# ПЕРСПЕКТЫВА — ЗА БУЙНЫМІ СЕЛЬГАСПРАДПРЫЕМСТВАМІ



**Пружаншчына, якую ў краіне пазнаюць па шматлікіх помніках архітэктурнай і культурнай даўніны і якая славіцца прыроднымі запаведнікамі ды Белавежскай пушчай з рэзідэнцыяй Дзеда Мароза, па сваёй вытворчай накіраванасці раён цалкам аграрны. Напрыклад, па валавой вытворчасці малака ён мае першы нумар у рэспубліцы. Нельга папракнуць аграрыяў і за якасць сыравіны — 99,2 працэнта малака паступае на перапрацоўку з адзнакай «клас «экстра» і «вышэйшы гатунак». Комплексы па адкорме буйной рагатай жывёлы і свіней таксама на добрым рахунку. Так, за апошнюю пяцігодку пружанцы змаглі павялічыць вытворчасць мяса больш чым у два разы. Уся гэта ўмоўная фабрыка малака і мяса складаецца з асобных сельгаспрадпрыемстваў, працаўнікі якіх атрымліваюцьназваную, а таксама раслінаводчую прадукцыю. Раней у раёне налічвалася больш за трыццаць калгасаў, цяпер аналагічных гаспадарак менш за паўтара дзясятка. Пра асаблівасці работы аграрнага сектара наша сённяшняя гутарка з намеснікам старшыні Пружанскага райвыканкама кіраўніком райсельгасхарчу Аленай ЛАПЫКАЙ.**

***— Алена Харытонаўна, многія цяперашнія гаспадаркі ўтвораны з трох былых, а то і большай іх колькасці. Ужо прайшло даволі часу, можна ацэньваць вынікі аб'яднання, параўноўваць вялікія з тымі, якія засталіся ў ранейшых межах. Рэарганізацыя праходзіла на вашых вачах, з вашым удзелам, у сельскай гаспадарцы раёна вы працуеце даўно. І сёння можаце сказаць, што...***

— Будучыня, перспектыва менавіта за буйнымі вытворцамі сельгаспрадукцыі. Узяць, напрыклад, гаспадарку «Ружаны-Агра» плошчай у 19 тысяч гектараў угоддзяў. Землі там далёка не лепшыя, спрэс — камяніца. Малыя гаспадаркі, якія ўвайшлі ў склад названага акцыянернага таварыства, мелі ў апошні час пакасчыкі, значна ніжэйшыя за сярэднія па раёне. Сёння ж ААТ — адно з найлепшых прадпрыемстваў раёна. Там правялі каласальную работу па навядзенні парадку на зямлі, прыбралі хмызняк, іншую лішнюю расліннасць, сабралі каменне з палёў. На адным з вытворчых участкаў ёсць поле велічынёй у 600 гектараў! І гэта ўжо зусім іншы ўзровень гаспадарання і захавання тэхналогій. Уявіце сабе, як працуе на пасяўной магутны трактар: без лішніх развароту, манеўраў. Такім чынам маем эканомію паліва, дадатковую магчымасць спецыялісту пракантраляваць і выправіць хібы ў працэсе работы, і яшчэ шэраг пераваг. Узровень вытворчасці вызначае эканоміку, і сёння названая гаспадарка займае другую пазіцыю ў раёне па зарплаце.

Эфектыўна працуюць і тыя прадпрыемствы, дзе сельгасугоддзі вымяраюцца сямю-васьмю тысячамі гектараў. А меншыя, былыя калгасы пушчанскай зоны, якія засталіся ў ранейшых межах, адчуваюць цяжкасці, звязаныя не толькі з геаграфічным становішчам. Пад апошнім маю на ўвазе, што палеткі «Роўбіцкага» аб'ядаюць дзікі і алені, а на пасевах «Муравы» з задавальненнем пасвяцца зубры. Як і названым прадпрыемствам, так і, напрыклад, «Белавусаўшчыне» не хапае размаху, каб набраць патрэбны тэмп развіцця і ўтрымліваць яго. Праўда, пакуль пытанне іх рэарганізацыі не разглядаецца, але гэта не значыць, што яно не ўзнікне з часам. Бо кожнаму прадпрыемству акрамя таго, што трэба вырошчваць хлеб, атрымліваць малако і мяса, неабходна ўзводзіць і мадэрнізаваць аб'екты, паляпшаць тэхнічны парк, укладваць сродкі ў тэхналагічнае абнаўленне. Для гэтага патрэбен трывалы фінансавы падмурак.

***— Калі звярнуцца да штодзённых клопатаў працаўнікоў вёскі, якія яны цяпер? Лічыцца, што зіма — параўнальна спакойны перыяд сельскагаспадарчай вытворчасці. Ці так гэта?***

— Гэта зусім не так. 85 працэнтаў выручкі нашы аграрыі атрымліваюць ад прадукцыі жывёлагадоўлі. А на ферме ці комплексе тэхналагічны працэс мала залежыць ад пары года. Праўда, у зімовы перыяд работы прыбаўляецца: трэба чысціць снег, у тым ліку з даху, дадатковую ўвагу надаваць абсталяванню — палілкам, сістэмам гноевыдалення і вентыляцыйнай.

Сёлета адчуваецца напружаная сітуацыя з кармамі. Засуха мінулага лета не дазволіла стварыць належную кармавую базу. Пачынаючы з восені, нашы гаспадаркі ўвялі жорсткі рэжым кантролю за рацыянальным і беражлівым расходаваннем кармоў, куплялі іх у іншых вытворцаў, купляюць і цяпер. Сітуацыя застаецца, як я сказала, напружанай, але не крытычнай. Сведчаннем таму ўстойлівы плюс па малацэ. У студзені малочная галіна раёна прыбавіла амаль на сем працэнтаў прадукцыі ў параўнанні з мінулым годам.

***— Чым займаюцца земляробы, акрамя традыцыйных працоўных водпускаў, якія звычайна прыпадаюць на зіму?***

— Работы хапае. Будучы ўраджай заўсёды плануецца зімой. Аграномы распрацоўваюць структуры пасяўных плошчаў, складаюць планы на кормавытворчасць, а гэта і ёсць стратэгія і тактыка будучага ўраджаю. Калі яе не выпрацаваць своечасова ў поўным аб'ёме, то нешта абавязкова вылезе ў выглядзе збою падчас палявых работ. Вядзецца падрыхтоўка і закупка насення, набыццё мінеральных угнаенняў і сродкаў абароны раслін. Яшчэ вялізны зімовы пласт работы — рамонт і падрыхтоўка тэхнікі да веснавых кампаній. Даўно склалася традыцыя ў лютым-сакавіку праводзіць так званыя ўзаемаправеркі. Што гэта значыць? Спецыялісты дзвюх гаспадарак разам з прадстаўнікамі райсельгасхарчу і іншых службаў абмяркоўваюць гатоўнасць арганізацыі і правядзення вясенне-палявых работ па ўсіх напрамках, арганізоўваюць агляд тэхнікі спачатку ў адной, потым у другой гаспадарцы. Любая машына альбо агрэгат літаральна пракручваецца на халастых абаротах. Спецыялісты абменьваюцца вопытам, нешта падказваюць адзін аднаму. Атрымліваецца карысны дыялог. Неяк мне давялося назіраць, як у адной гаспадарцы на ўзаемаправерцы сусед падгледзеў навес на запраўцы, налета ўзвёў такі ў сябе. Падобная форма работы захавалася, здаецца, з савецкіх часоў, але мы не збіраемся адмаўляцца ад яе, бо адчуваем дзейснасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*


**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**«Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения №19 по генплану в жилом квартале в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства)»,**
***опубликованную в газете «Звязда» №191 за 08.10.2014 года***

Застройщик – иностранное строительное унитарное предприятие «Атлант-М Строй», доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения №19 по генплану в жилом квартале в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства)» (опубликованную в газете «Звязда» №191 за 08.10.2014 года).

Раздел **«Цена объекта долевого строительства»** дополнить абзацем следующего содержания:

Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются для заключения договоров долевого строительства две 3-комнатные квартиры на выбор, расположенные в 1-й, 2-й, 3-й секциях объекта, стоимостью за 1 кв.м льготируемой площади 15 729 400 рублей, площадь, превышающая льготируемую, оплачивается на условиях аналогичных категории граждан не нуждающихся в улучшении жилищных условий. Указанная стоимость 1 кв.м действует до 5.04.2016 г.

Раздел **«прием заявлений от граждан»** дополнить абзацем следующего содержания:

Прием заявлений от граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, осуществляется в приемной иностранного предприятия «Атлант-М Строй» (г. Минск, пер. Козлова, 7Б, правое крыло, 2 этаж, тел. 297 94 70) с 5 марта 2016 г.

УНН 800005787

# ЗАЦВЕРДЖАНЫ ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ЦТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пакуль што ўсё засталося без змен. Здаць у рэзервовы дзень (5 ліпеня) можна будзе толькі адну дысцыпліну і толькі па ўважлівай прычыне. Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовы дзень устаноўлены з 28 чэрвеня па 1 ліпеня. Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў гэты дзень вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў нагадалі, што ў сакавіку ў краіне стартуе апошні, трэці раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання. Пералік устаноў, дзе рэпетыцыя будзе праводзіцца па матэрыялах арганізатараў цэнтралізаванага тэсціравання, можна знайсці на сайце інстытута (www.rikc.by). Працэдура правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання нічым не адрозніваецца ад цэнтралізаванага: і колькасць заданняў у тэсце, і яго структура, і час, адведзены на выкананне, і нават бланк адказаў на рэпетыцыі такія ж, як і на галоўным выпрабаванні. Задача арганізатараў у аўдыторыях — прытрымлівацца ўсіх правіл правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення экзамену: прысутнасць мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі катэгарычна не дапускаецца. У гэтым навучальным годзе ўпершыню пасля завяршэння кожнага этапу рэпетыцыйнага тэсціравання абітурыенты на сайце інстытута па асабістым кодзе ўдзельніка тэсціравання могуць атрымаць рашэнні заданняў тэста і іх аналіз для самастойнай работы над памылкамі.

Непасрэдна ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў для ўсіх ахвотных арганізуецца і камп'ютарнае тэсціраванне. Падчас яго прапануюцца заданні з той жа базы, што і на звычайным. Розніца ў тым, што абітурыент працуе перад камп'ютарным маніторам і напрыканцы выпрабавання можа адразу даведацца свой вынік. У абітурыента ёсць магчымасць тут жа папрацаваць над сваімі памылкамі. Спачатку да няправільна выкананых заданняў яму даецца падказка, а калі і яна не дапамагае, можна проста «падглядзець» правільнае рашэнне.

Кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні (і камп'ютарным, і на папяровых носьбітах) складае 61 тысячу рублёў за кожны прадмет. На сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў адкрыта анлайн-рэгістрацыя на камп'ютарнае тэсціраванне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Да ведама

## ВЫЗНАЧАНЫ КРАІНЫ, ДЗЕ ПАДМАНУЦЬ — ШТО ПАПЯРОСКУ СКУРЫЦЬ

**Днямі прэс-служба Беларусбанка распаўсюдзіла інфармацыю аб тым, што сёлета з другой дэкады лютага тэхнічнай службай гэтай фінансавай установы ўводзяцца пэўныя абмежаванні пры выкарыстанні плацежных картак гэтага банка за мяжой.**

Такім чынам, уведзеныя абмежаванні тычацца картак Visa, MasterCard і Maestro, калі апошнія выкарыстоўваюцца для зняцця наяўных грашовых сродкаў у банкаматах і такая аперацыя выконваецца праз счытванне індывідуальнай інфармацыі з магнітнай паласы «пластыку».

Спецыялісты Беларусбанка паведамляюць, што **па плацежнай сістэме MasterCard** агучаныя **абмежаванні дзейнічаюць** на тэрыторыі такіх краін, як **Камбоджа, Малайзія, Непал, Філіпіны, В'етнам, Паўднёвая Карэя, Індыя, Інданезія, Тайланд, Тайвань, Кітай, Японія і ЗША.** Карткі сістэмы **VISA і Maestro будуць мець пэўныя цяжкасці з гатоўкай у Непале, Індыі, Інданезіі, Тайландзе, Тайвані, Кітаі, Японіі і ЗША.**

З чым гэта звязана? Справа ў тым, што ў пералічаных краінах існуе высокая верагоднасць здзяйснення ашуканскіх аперацый з выкарыстаннем рэквізітаў плацежных картак, паколькі не ўсе банкаматы забяспечваюць правядзенне аперацый са счытваннем мікрапрацэсара (чыпа) карткі. Уведзеныя банкам абмежаванні накіраваны на зніжэнне рызыкі ўчынення падобнага кібермахлярства і, адпаведна, на забеспячэнне захаванасці грашовых сродкаў трымальнікаў плацежных картак банка.

Разам з тым эксперты міжнароднага сектара па картkавым абслугоўванні кліентаў удакладняюць, што на аперацыі, якія ажыццяўляюцца са счытваннем інфармацыі з мікрапрацэсара (чыпа) карткі, названыя абмежаванні не распаўсюджваюцца. Абмежаванні не распаўсюджваюцца і на безнаяўныя аперацыі аплаты ў арганізацыях гандлю і сэрвісу, у інтэрнэт-крамах, аперацыі зняцця гатоўкі ў пунктах выдачы наяўных грошай устаноў банкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Фінансаванне

## БМЗ ДАЗВОЛІЛІ ЗГУЛЯЦЬ У КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ

**Такім чынам, цяпер Беларускі металургічны завод атрымаў права на выпуск валютных аблігацый на агульную суму 240,5 млн долараў. Рашэнне аб гэтым было размешчана ўчора на сайце Нацыянальнага прававога партала.**

У гэтым дакуменце гаворыцца, што выкананне абавязацельстваў па аблігацыях забяспечваецца закладам нерухомай маёмасці, якая належыць эмітэнту на праве ўласнасці. Падлічана, што памер кошту закладзенай маёмасці дастатковы для ажыццяўлення 50% аб'ёму эмісіі аблігацый кожнага выпуску.

Вызначаны і ўмовы выпуску такіх каштоўных папер. Працэнтны даход па аблігацыях складзе не больш за 7% гадавых, а выпушчаны яны будуць на тэрмін да пяці гадоў.

Размяшчаць аблігацыі рэкамендавана шляхам закрытага продажу ў межах сум запазычанасці эмітэнта па раней прадастаўленых крэдытах шасці найбуйнейшых банкаў краіны. Сярод асобных умоў размяшчэння з'яўляецца тое, што ўладальнікамі аблігацый могуць выступаць толькі рэзідэнты нашай краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Ну і ну!

## І не ўбачыць дна ў таго самагону...

**Найбуйнейшы ў краіне самагонны цэх ліквідаваны ў Маладзечанскім раёне, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама. Самагонны цэх 40-гадовы непрацуючы жыхар вёскі Яхімоўшчына Маладзечанскага раёна вырашыў арганізаваць прама на падворку.**

Гаспадар паставіў вытворчасць самагону на прамысловую аснову: брага «спела» ў чатырох тысячалітровых спецыяльных ёмістасцях, якія падаграваліся газавымі гарэлкамі. Для гэтага адначасова падключаліся два балоны з прапанам, аб'ём ёмістасці для кандэнсацыі спіртавых пароў складаў больш за 3 тысячы літраў, а гатовы прадукт выцякаў па чатырох змеевіках адначасова.

Дом і двор акружала высокая агароджа, іх ахоўвалі сабакі і сістэмы відэаназірання. Падчас «працэсу» дом пільнавалі яшчэ і сваякі гаспадара. Па самых сціплых ацэнках, магутнасці завода дазвалялі атрымліваць больш за 500 літраў самагону за адну гонку, а выкарыстанне газу выключала наяўнасць тыповых прыкмет самагонаварэння: дыму з коміна, сажы і паху. Адходы вытворчасці перавозіліся на свінаферму побач, якая належала ўладальніку падворку. Ферма стала прыкрыццём для самагоннага цэха: не выключаючы падазрэнняў, мужчына спакойна купляў і прывозіў дадому буйныя партыі мукі, нібыта на корм жывёле. Каб узяць самагоншчыка з доказамі злачынства, АМАПаўцы некалькі гадзін сядзелі ў засадзе і вялі назіранне за домам. Канфіскавана 240 літраў самагону, каля 6 тон брагі і самагонны апарат.

### ДАРЭЧЫ

**Калі гаварыць пра Маладзечанскі раён, дык, напрыклад, у чэрвені мінулага года на тэрыторыі закінутага хутара непадалёку ад вёскі Клапачы была выяўлена самагонная лінія, устаноўленая ў хляве плошчай больш за 300 квадратных метраў. Падача вады вялася са свідравіны глыбінёй больш за 70 метраў чатырма помпамі, для электразабеспячэння выкарыстоўваўся магутны генератар. Было знойдзена звыш 12 тысяч літраў брагі. У маі 2012 года на тэрыторыі вёскі Боркі завод па вытворчасці самагону быў абсталяваны ў гаспадарчых пабудовах прыватнага дома. Канфіскавана 20,6 тоны брагі і 800 літраў гатовага «прадукту». За пяць гадоў да гэтага ў лясным масіве паблізу Клачкова быў знішчаны самагонны апарат з 50 тонамі брагі...**

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Як нас дураць

## АЎТАХАУС З КРЫМІНАЛЬНЫМ УХІЛАМ

**З заявамі аб махлярстве заснавальніка сталічнага аўтахауса ў міліцыю звярнуліся 16 грамадзян, і звароты працягваюць паступаць.**



— 31-гадовы мінчанін увесну мінулага года арганізаваў па вуліцы Ціміразева аўтахаус. Характэрна, што малады чалавек раней працаваў менеджарам па продажах у аўтахаусе, які размяшчаўся па вуліцы Няміга і чые заснавальнікі ў красавіку 2015 года былі затрыманы па падазрэнні ў махлярстве. У перыяд з леташняга мая аўтахаўс заключаў дагаворы па аказанні паслуг па продажы аўтамабіляў па дагаворы камісіі. Складаючы дагавор, кліенту гарантавалі продаж аўто па досыць высокай цане. На самой жа справе частка перададзеных на рэалізацыю аўто перазакладвалі, а таксама перадавалі ў кошт пагашэння даўгоў заснавальніка аўтахауса, — расказала **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Тацццяна АБОЗНАЯ.**

Так, напрыклад, адзін з пацярпелых у лістападзе мінулага года перадаў па дагаворы камісіі аўтамашыну «Крайслер» 2005 года выпуску, якую аўтахаус абавязаўся рэалізаваць на працягу 30 дзён за 11,5 тысячы долараў. Праз указаны тэрмін мужчына звярнуўся ў кампанію і даведаўся, што яго аўто не прададзена, аднак у аўтахаусе яго таксама няма. Дырэктар жа на кантакт не выходзіў. Мужчына звярнуўся па дапамогу ў міліцыю. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку высветлілі, што заснавальнікам аўтахауса машына была перададзена іншай асобе ў лік пагашэння доўгу.

У супрацоўнікаў крымінальнага вышуку ёсць падставы меркаваць, што пацярпелых можа быць значна больш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


Куделевич Сергей Николаевич

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОДАЖЕ АКЦИЙ**

**ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования»**
в количестве 566 простых акций (7,3553% Уставного фонда)
по цене не ниже 184 долларов США за акцию
по курсу Национального банка на день оплаты.
По вопросу приобретения обращаться по адресу:
г. Солигорск, а/я 16, м.т. +37544-5602279.


## ПАЗВАНІЦЬ І ЗАПЫТАЦЦА

Як вядома, у нашай краіне са студзеня мінулага года арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній у мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння ў людзей праблемных пытанняў.

**Гэтая субота не стане выключэннем, 27 лютага з 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
кіраўнік справамі СТЭЛЬМАХ Антон Сцяпанавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
старшыня ШАРСТНЁЎ Мікалай Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васільевіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
кіраўнік справамі КОТАЎ Мікалай Аляксандравіч (80172224444).

■ Май на ўвазе

## ПАКІНЕМ ШЧУПАКОЎ У СПАКОІ

**Забарона на лоўлю шчупака ўводзіцца ў краіне з 1 сакавіка, паведамілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

У перыяд з 1 сакавіка па 15 красавіка, у адпаведнасці з пунктам 107 Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, вылаў шчупака звычайнага забаронены. У Віцебскай вобласці забарона будзе дзейнічаць з 9 сакавіка па 25 красавіка. Шчупак па тэрмінах нерасту апярэджвае ўсе віды рыб, адкладае ікру ў сакавіку-красавіку пры тэмпературы вады плюс 4-6 градусаў. Нераст пачынаецца адразу ж пасля раставання лёду і адбываецца на невялікіх глыбінях у прыбярэжнай зоне вадаёмаў, а таксама на пойме рэк і ручаёў. Від становіцца безабаронным перад чалавекам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



## ГУЛЬНЯ Ў РАДАСЦЬ

Маленькі дэльфін рэдкага віду ла-плацкі выкінуўся на бераг Атлантычнага акіяна ў Аргенціне. І адразу трапіў у рукі турыстаў. Замест таго, каб вярнуць малога назад у ваду, яны пачалі рабіць з ім сэлфі. І жывёла памерла ад абязводжвання і перагрэву проста на руках у аднаго з мужчын. Жорсткасць людзей, што прагнулі зрабіць здымак з дэльфінам, не ўціхла нават пасля таго, як ён загінуў. Турысты працягвалі з ім фатаграфавацца. Здымкі радасных людзей з мёртвым дэльфінам на руках разляцеліся па інтэрнэце... А мне ўжо каторы дзень не дае спакою тая радасць. Радасць праз пакуты іншых...

Мне па душы іншая гульня ў радасць — тая, якую прапанавала Паліяна. Маленькая дачка святара марыла пра прыгожую ляльку. А ў пасылцы з дабрачыннага камітэта, што трапілася ёй, аказаліся дзіцячыя мыліцы. Дзяўчынка спачатку засмуцілася. Але тата сказаў: «Паліяна, трэба радавацца!». Здавалася б, чаму можна радавацца, калі замест лялькі табе даюць мыліцы? «Радуйся, што яны табе не патрэбны!». З таго часу Паліяна з татам пачалі гуляць у радасць. Гульня зводзілася да таго, каб ва ўсім на свеце знаходзіць што-небудзь такое, чаму можна радавацца... «Разумееце, калі шукаеш, чаму радавацца, то адразу забываеш пра ўсё астатняе, ну, напрыклад, пра тое, што табе хацелася лялькі...»

Гадоў восем таму паехалі мы з сяброўкамі ў Балгарыю. Было гэта ў верасні. Практычна ўсе чатырнаццаць дзён нашага адпачынку ішоў дождж. Мы вымушаны былі хадзіць у куртках і амаль не пакупаліся, бо мора было халодным. Больш за тое, я застудзіла нагу. Даводзілася кульгаць, бо было балюча ступаць. Тым не менш, у той час, як адна з сябровак ныла, я (натхнёная казачнай гісторыяй Элінор Портэр пра Паліяну), не стамлялася знаходзіць нагоды для радасці, чым моцна яе раздражняла. «Ой, як цудоўна: раз мы не можам купацца, давайце паедзем у Турцыю! Яна ніколі не была так блізка, калі яшчэ надарыцца такая магчымасць?». У Стамбуле ў мяне падчас экскурсіі па палацы султана зламаліся акуляры... Нягледзячы на тое, што дрэнна бачыла, працягвала радавацца — бо маю магчымасць чуць, адчуваць, што ўпершыню пакаштавала смажаныя каштаны...

Часам, вядома, бывае вельмі складана знайсці нагоду для радасці. Але і ў такія моманты я згадваю Паліяну, якая пайшла праведваць місіс Сноў, прыкаваную да ложка. Жанчына пастаянна была чымсьці не задаволена: прынясуць цялячы студзень, дык яна абавязкова скажа: «Лепш бы вы прынеслі курыцу». А варта прынесці курыцу — і яна адразу ж захоча поліўкі. На гэты раз місіс Сноў пачало раздражняць, што Паліяна ўсяму радуецца і заклікае радавацца і яе. І яна выпаліла: «Я шмат дзён прыкавана да ложка! Чаму мне радавацца?». Паліяна разгубілася: «Я пакуль не ведаю адказу на вашае пытанне. Але тата казаў, што заўсёды можна знайсці нагоду для радасці. Я зараз павінна ісці, але абяцаю вам, што буду ўвесь час думаць над гэтым, пакуль не прыдумаю». Праз некалькі дзён вярнулася і радасна паведаміла: «Я падумала... Вы можаце радавацца, што астатнім не так дрэнна, як вам!»

...Аднаго чалавека выкінула на бязлюдны востраў. Кожны дзень ён выглядваў на гарызонце, ці не ідзе які-небудзь карабель яго выратаваць. Але караблёў усё не было і не было. Больш за тое, аднойчы маленькі шалаш, які ён пабудаваў з выкінутых на бераг палак і дошак і ў якім знаходзіўся ўвесь запас ежы, загарэў дашчэнту. Дым слупом падымаўся ў неба, а чалавек рыдаў: «Божа, як ты мог так паступіць са мной?!». Аднак на наступны дзень да вострава прычаліў выратавальны карабель. «Як вы даведаліся, што я тут?» — спытаў чалавек. «Мы ўбачылі твой дымавы сігнал», — адказалі мараходы. Бывае так, што дом, які гарыць, становіцца сігналам для ратавання. Хто ведае...

Дарэчы, на сцэне Тэатра юнага гледача ў Мінску аднавілі спектакль «Паліяна» на беларускай мове. Схадзіце ўсёй сям'ёй, не пашкадуеце! Магчыма, і вас, як і мяне калісьці, маленькая дзяўчынка зменіць сваім «Я так рада...».

**Надзея ДРЫЛА.**


# Сямейная газета

Выпуск № 4 (47)


■ Тыя, хто побач

# НЕПРЫДУМАНАЕ КАХАННЕ,

## або Вершы шчасцю не нашкодзяць

**У гісторыі кожнай пары ці не самы цікавы момант — знаёмства. А ў выпадку Людмілы Рублеўскай і Віктара Шніпа — тым больш. Не толькі таму, што яны пісьменнікі: асаблівай робіць гісторыю іх адрознасць. У 1986-м, годзе іх сустрэчы, Людміла была ўзнёслай рамантычнай дзяўчынай з вельмі строгімі поглядамі на жыццё і высокімі ідэаламі ў галаве. Пры сабе яна мела рускамоўныя вершы і мару прысвяціць сябе паэзіі. Віктар на той час ужо меў кнігу — з вершамі беларускамоўнымі і вострасацыяльнымі («нармальны беларускі савецкі паэт», як ён кажа), а за плячыма — сем гадоў прыгодаў з падпрацоўкамі грузчыкам на лікёра-гарэлачным заводзе і літкансультацыямі ў розных выданнях. Яна — «гарадская», з сям'і сталічных інтэлігентаў, ён — вясковы хлопец. Словам, паненка і хуліган.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### «Мне яшчэ ў школе наваражылі жонку Людмілу»

— Калі б сустрэліся ў іншых абставінах, не ведаю, ці атрымалася б нешта, — прызнае Людміла Іванаўна. — Але мы апынуліся ў Літаратурным інстытуце імя Горкага ў Маскве. Дзяўчына, з якой я жыла ў пакоі, была тых жа строгіх поглядаў, што і я, і наш пакой празвалі «манастыр»: мы не хадзілі на танцы, хлопцаў не вадзілі, гаспадарка — па мінімуме. Праз нейкі час адна мая знаёмая вырашыла знайсці свайго земляка з вышэйшых літаратурных курсаў: там вучыліся члены Саюза пісьменнікаў, сталыя, нават сямейныя. Пайсці адна яна баялася, і мы разам, трымаючыся пад ручку і шарахаючыся ад брутальных пісьменнікаў, падняліся на сёмы паверх. Яе земляка не аказалася на месцы — тады я ўспомніла, што на Вышэйшых літаратурных курсах вучыцца мой зямляк, пра якога мне казалі яшчэ перад ад'ездам у Маскву...

— Гэта было 8 верасня 1986 года, — працягвае Віктар Анатолевіч. — У дзень нараджэння майго бацькі прыйшла да мяне будучая жонка... Цікава, што за восем месяцаў да таго я натрапіў на літаратурную перадачу па тэлебачанні з удзелам маладых пісьменнікаў. Сярод іх была Люда. Сімпатычная такая. Нечым запомнілася. Ну, думаю, трэба, як вярнуся з Масквы, знайсці яе, пазнаёміцца... Дый мне яшчэ ў школе наваражылі жонку па імені Людміла.

І вось мы з сябрамі сядзім на інтэрнацкай кухні ў Маскве. Варым, курым. Па калідоры ідуць нейкія дзяўчаты. Да каго? Усе прытаіліся, нават газу прыцішылі, каб сала не сквірчэла. Слухаем крокі. Спыніліся каля майго пакоя. Я не паверыў, выглянуў: праўда стаяць. Запрасіў...

**Л:** Ты сядзеў, чырванеў, мяўся, пасля схапіў сшытак з вершамі...

**В:** Выратавальны круг.

**Л:** Пачынаючы з другой сустрэчы ён пачаў казаць, што возьме замуж. І так паўгода. На першае спатканне павёў у Цэнтральны дом літаратара — хацеў зрабіць уражанне.

**В:** А як вярталіся, у ліфце я адразу націсну на свой паверх. Думаў, чаю пап'ём, вершы пачытаем. Адкрываюцца дзверы, а яна — уцякаць!

**Л:** Мяне гэта абурыла: нічога не запытаўшы, вязе да сябе!.. Я больш не збіралася да яго прыходзіць, але зноў дапамог выпадак. Мы не дужа ладзілі з новай суседкай, узбечкай: розніца менталітэтаў, разыходзіліся погляды на вядзенне гаспадаркі, ёй не падабалася, што я позна вяртаюся дадому (штовечар хадзіла ў тэатры). І аднойчы яна зачынілася ў пакоі. Было вельмі позна, і я ў поўным адчаі пайшла да Віктара. Ён напаіў гарбатай, вядома, прапанаваў у яго заначаваць — але я звярнулася да знаёмай. Пасля ён мяне элементарна прыкарміў: хадзіла да яго снедаць і вячэраць, па выходных яшчэ і абедала.


***(Заканчэнне на 4 стар. «СГ».)***


■ У вас будзе дзіця

# Ты ляці, ляці, жураўлік

**Вось ужо чатыры гады на тэлеканале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома» выходзіць беларуска-расійская рубрыка «У вас будзе дзіця». За гэты час 67 малых знайшлі клапатлівых бацькоў. Спадзяёмся, што з нашай дапамогай гэтая лічба яшчэ павялічыцца. Таму працягваем знаёміць патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з дзеткамі, якія больш за ўсё на свеце мараць пра сям'ю і ўтульны дом...**



Сёння мы зноў у Андрэеўскім дзіцячым доме Віцебскай вобласці. Нашага новага героя завуць Валера. Яму 11 гадоў. Хлопчык мае шмат захапленняў. Усе выхавацелі і сябры адгукаюцца пра Валеру толькі станоўча.

— Наш Валера спакойны, стрыманы, адказны, вельмі старанны хлопец, — распавядае **педагог-псіхолаг Людміла ПАДЛЕПЕНКА.** — Калі ён за нешта бярэцца, то перажывае за вынік. Стараецца давесці і распачатае да канца. Вельмі працавіты і добры. Любіць жывёл, дапамагае даглядаць маленькіх дзетак. Ахвотна ходзіць у школу. Мае добрыя адзнакі па асноўных прадметах, але любімыя — матэматыка і «Чалавек і свет». Любіць глядзець перадачы пра жывёл, падарожжы. У будучым марыць стаць машыністам, каб аб'ехаць увесь свет і паглядзець розныя краіны. Любоў да матэматыкі стала стымулам для Валеры займацца шахматамі ў гуртку. Гэта яго новае хобі. Як і ўсе хлопчыкі, Валера любіць спорт. Па стане здароўя яму супрацьпаказаны вялікія нагрузкі, але пагуляць у тэніс з хлопцамі ці пакідаць баскетбольны мячык — гэта ён робіць з задавальненнем.

— Падчас здымак для праграмы «Пакуль усе дома» Валера прызнаўся, што любіць рабіць арыгамі. Пасля гэтых слоў змайстраваў папяровага жураўліка. «Гэты жураўлік з'яўляецца сімвалам выканання жаданняў. І я хачу, каб мне знайшлі бацькоў... добрых».

Застаецца пажадаць, каб Валерава мара хутчэй ажыццявілася.

***Калі вы хочаце даведацца пра Валеру больш, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51 спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта***

■ Беражыце сябе

# МАМА, ЯК ТЫ ТАМ?

## Стала дрэнна? Дапаможа асабістая «трывожная кнопка»



**У Беларусі з'явілася новая паслуга для пажылых і людзей з абмежаванымі магчымасцямі — першая персанальная медыцынская сігналізацыя «Лінія жыцця». Яна ўяўляе сабой асабістую «трывожную кнопку» SOS с падключэннем да кругласутачнага цэнтра дапамогі.**

У ініцыятара праекта «Лінія жыцця», **сацыяльнага прадпрымальніка, кіраўніка ТАА «Валеандр груп» Андрэя БАБАЕДА,** медыка па адукацыі, тры гады таму родная бабуля пайшла даіць карову, і ў хляве з ёй здарыўся сардэчны прыступ. «Яна ўпала і праляжала дзве гадзіны ў гноі пры тэмпературы недзе 5 градусаў, — распавядае Андрэй Бабаед. — Выратаваў яе мой дзядзька, які ішоў на агарод і пачуў крыкі. Калі б не было побач гэтага агарода, то маглі б і не выратаваць. І такіх выпадкаў вельмі шмат. Мама мне расказала гісторыю пра тое, як суседка яе ўзросту, крыху старэйшая за 60 гадоў, упала ў сваёй кватэры на кухні. Яе сталі шукаць толькі на наступныя суткі, калі яна не выйшла на працу. На жаль, знайшлі ўжо нежывой...»

Статыстыка сцвярджае, што большасць выпадкаў падзення пажылых людзей адбываецца дома, асабліва часта — у ванным пакоі і спальні. Пры гэтым каля 80% няшчасных выпадкаў здараецца, калі яны знаходзяцца адны, без сведак. Пажылому чалавеку складана, а часта і проста немагчыма пры гэтым дацягнуцца да тэлефона, а непрытомны чалавек сам сабе дапамагчы не можа. Між тым медыкі добра ведаюць, што ў выпадку інсульту ці інфаркту вельмі важна аказаць медыцынскую дапамогу на працягу першай гадзіны. Калі такая дапамога аказана своечасова, верагоднасць ускладненняў і смерці зніжаецца ў 5 разоў — гэта сусветная статыстыка.

Асабістая «трывожная кнопка» выглядае як кулон памерам з дзіцячы кулачок ці бранзалет, падобны да мужчынскага электроннага гадзінніка, які неабходна заўсёды насіць з сабой. Яна дазваляе выклікаць дапамогу адным націскам на яе. Калі ж чалавек упаў і страціў прытомнасць, альбо пры прыступе інфаркту, інсульту, пераломе шыйкі сцягна, яна аўтаматычна, з дапамогай спецыяльнага датчыка падзення, адправіць сігнал аб тым, што чалавеку патрэбна дапамога. Усе гэтыя сігналы ўмомант паступаюць у кругласутачны цэнтр дапамогі, дзе на лініі дзяжурыць аператар — медыцынскі работнік.

Калі чалавек у стане растлумачыць, што з ім здарылася, аператар у залежнасці ад сітуацыі накіроўвае да яго хуткую дапамогу, міліцыю, пажарную службу, сацыяльнага работніка або ўчастковага доктара.

— Пры гэтым аператар таксама аператыўна звяжацца з суседзямі, сваякамі або сацработнікамі — у каго ёсць ключы ад кватэры, — распавядае кіраўнік праекта. — Таму што, калі кватэра замкнутая знутры, медыкі «хуткай дапамогі» ламаць дзверы не будуць, работнікі міліцыі — таксама, пакуль не прыедуць блізкія сваякі або сацслужбы. А гэта ўсё займае час, які ў такой сітуацыі — на вагу золата...

Менавіта таму, што з уладальнікам «трывожнай кнопкі» або яго сваякамі папярэдне заключаецца дагавор на абслугоўванне, у базе даных аператар сам знойдзе і адрас, і кантакты родных ці суседзяў, і іншыя звесткі, названыя па жаданні, і за лічаныя секунды накіруе адпаведны выклік. Таксама сістэмай прадугледжана, як дзейнічаць, калі кнопку чалавек націснуў, але паведаміць што-небудзь не ў стане.

**Асабістая «трывожная кнопка» выглядае як кулон з дзіцячы кулачок ці бранзалет, падобны да мужчынскага электроннага гадзінніка, які неабходна заўсёды насіць з сабой.**

— Мы абслугоўваем усю тэрыторыю Беларусі. У асноўным да нас звяртаюцца дзеці пажылых людзей, часцей за ўсё дочкі, якія хочуць панізіць трывогу, неспакой за сваіх бацькоў. Каб не тэлефанаваць па 4-5 разоў на дзень: «Мама, як ты там?» — кажа Андрэй Бабаед. — У Еўропе і ЗША такія прылады з'явіліся ўжо 40 гадоў таму і на сённяшні дзень вельмі распаўсюджаныя. Там лічаць кожную капейку і разумеюць, што пратэрмінаваны інсульт ці інфаркт выліваецца ў значныя сумы грошай.

У будучыні плануецца пашырэнне пакета паслуг «Лініі жыцця». На думку ініцыятараў, стануць магчымымі атрыманне кансультацый псіхолага, юрыста, выклік сацыяльнага таксі. «Калі ўдасца ўзгадніць з падатковай службай правядзенне «трывожных кнопак» па дакументах як інструментаў па рэабілітацыі і прафілактыцы інваліднасці, то мы не будзем аплачваць падатак на дабаўленую вартасць, і для людзей кошт гэтай паслугі адпаведна стане таннейшым на 20%», — гаворыць Андрэй Бабаед.

Праект «Лінія жыцця» з'яўляецца тэмай магістарскай дысертацыі Андрэя Бабаеда і рэалізуецца па ініцыятыве і пры рэсурснай падтрымцы Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■ 50+: Жыць цікава

# ДЫЙ ПАЕДЗЕМ ДАГАНЯЦІ ГАДЫ МАЛАДЫЯ...

**Таісія САЎЧУК з вёскі Горталь Івацэвіцкага раёна нарадзіла ажно 14 дзяцей! Узнагароджана ордэнам Маці, атрымлівае ад дзяржавы даплату да пенсіі. Мала таго, гэтая цудоўная жанчына мае шмат працоўных узнагарод. Сярод іх ордэн «Знак Пашаны» і бронзавы медаль ВДНГ. І гэта яшчэ не ўсё. Таісія Міхайлаўна — актыўная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці, шмат гадоў спявае ў вядомым у раёне калектыве «Гарталянка». На днях ёй, жанчыне з залатым сэрцам і душой, споўнілася 80 гадоў, і мы завіталі ў яе дагледжаную і прыгожую — што з вуліцы, што ў сярэдзіне — хату.**



## Са свякроўю — у адной хаце

Гадавалася Таісія Міхайлаўна ў шматдзетнай сям'і. Замуж бацькі выдалі рана, за гортальскага хлопца, маладога, яшчэ і ў арміі не служыў.

— Мішу майго забралі ў армію на тры гады, я засталася на руках з дачкой Галяй у маленькай хатачцы з сям'ёй свекрыві. Праз колькі часу прыходзіць пісьмо ад мужа: «Я калека, трапіў у аварыю, пераламала мне ногі і рукі. У шпіталі буду доўга»... Плачу. Што рабіць? Праведаць няма за што, ды і думаць цяпер трэба самой, як жыць далей...

Неяк прыехаў на поле прадстаўнік з «белага дома», стаў запісваць жанчын на заём па 25 рублёў. Таісія Саўчук набралася смеласці (можа, адзіны раз у жыцці) і адмовілася браць заём, яшчэ і запрасіла начальніка з раёна паглядзець, у якіх умовах жонка інваліда Савецкай Арміі гадуе дзіця. І прыйшла камісія, паглядзелі з дарогі на бядоту і прапанавалі лесу на хату па льготнай цане, за 11 рублёў. «Я думаю: у мяне ёсць усяго шэсць рублёў, за іх мне трэба дажыць да новага года з дзіцем, і калі іх усе аддаць на лес, то ўсё роўна не хапае яшчэ пяці рублёў, — успамінае жанчына і змахвае слязу. — Пашкадавала нас свякроў, дала са свайго небагатага запасу пяць рублёў, але давялося жыць усім да новага ўраджаю без белага хлеба, на вадзе». Купіла тады за тыя грошы маладая жанчына 18 кубоў лесу ў Новіне, зрэзала яго сама, паабсякала і падрыхтавала да вывазкі. Вывозіць дапамагаў ужо гаспадар, які вярнуўся інвалідам II групы Савецкай Арміі. А праз зіму пачалі будаваць сваю хату.

## Дзяцей як гароху

Дзяцей і сапраўды Бог даў шмат. Пасля старэйшай дачкі нарадзіліся двайняты: хлопчык і дзяўчынка. Дзяўчынка праз год памерла, а хлопчык Віця, гарманіст і весялун, увесь у бацьку, памёр у 45 гадоў — рак. Дзевяць дачок, тры сыны з'ехаліся да маці сем'ямі (26 унукаў і 14 праўнукаў) у юбілей.

Староста вёскі Валянціна Якімовіч, якая працавала да пенсіі ў сельсавеце, успамінае, як аднойчы пасля родаў прыйшоў Міхаіл Міхайлавіч запісваць дзіця.

— Я пытаюся, якое імя выбралі сыну? А Саўчук кладзе мне на стол стос пасведчанняў аб нараджэнні і кажа: «Пішыце любое імя, толькі, каб не паўтаралася ў гэтым стосе», — кажа Валянціна Аляксееўна. — Падумала я, падумала, ды і прапанавала Аркадзем назваць, харошы чалавек з такім імем працаваў у сельсавеце. Запісала, а Міхаіл Міхайлавіч: «Назвалі, вось і добра». Забраў дакументы і пайшоў. Сёння ў вёсцы каля 30 шматдзетных сем'яў, але ў іх па трое дзяцей, зрэдку 4-5. Таісія Міхайлаўна — сапраўдная гераіня, такіх у раёне больш няма.

Медсястра ФАПа вёскі Ева Лазюк калісьці здзіўлялася цярплівасці Таісіі Міхайлаўны. Неяк яна прыйшла наведаць сям'ю шматдзетную, а гаспадыня мыла падлогу. Дзеці туды-сюды бегаюць па хаце, замінаюць ёй, а яна хоць бы слова сказала, хоць бы заўвагу зрабіла ці шлёпнула каго. Мае, быццам ніхто ёй не перашкаджае...

— А што ж крычаць ці біць? Трэба і пабегаць, падурэць, на тое і дзеці. Горш, калі не хочуць бегаць. Значыць, хворыя тады. Лепш няхай бегаюць. Трэба будзе, памыю яшчэ.

## На сняданак — два кастры бліноў

Вядома, мукі пачак Таісія Міхайлаўна ніколі не купляла. Мех, сама менш. А на сняданак традыцыя была кожную раніцу два кастры бліноў белых.

— Бліны пякла вялікія, на патэльню, — кажа гаспадыня. — Апошні блін быў мой. Яго з'ем са смятанай — і на работу.

Працавала Таісія Міхайлаўна палявадам. У савецкія часы гэта была ў асноўным ручная праца. Як той казаў, рабіла, як вол. Не за прыгожыя вочы атрымаць можна было ордэн простай жанчыне. А бронзавы медаль на ВДНГ — наогул стаханаўкай трэба было быць. Працавала да пенсіі і потым яшчэ 10 гадоў на пенсіі.

Сям'ю вялікую калісьці апрануць было складана, усё ў дэфіцыце. Калі траплялася тканіна, Таісія Міхайлаўна брала палобльш метраў. Шыла на швейнай машыне і сукенкі, і кофтачкі, і штаны, і халаты.

— Памятаю, як Тані пашыла касцюмчык з карычневай тканіны ў гарошак. Яна прыбегла са школы і такая шчаслівая з парога мне крычыць: «Мама, усе ахнулі, дзе мне такі прыгожы касцюм купілі!»

## «Не судзіце, каб і вас не судзілі»

Гадоў колькі таму доктар адзін у раёне сказаў Таісіі Міхайлаўне, што тая не жылец, месяц ад сілы працягне. А яна паехала ў абласны цэнтр на аперацыю і цяпер жыве. І доктару таму даравала.

У адной жаночай слабасці прызнаецца Таісія Міхайлаўна — да ўнучкі Дашы душа прыкіпела. «Жылі разам колькі гадоў, а як прыехаў па яе муж, каб у Брэст забіраць, я маліла доктара адпусціць дадому. Пусціла. А тут і адна дачка прыехала, і другая, поўная хата гасцей. Правялі Дашку, але галава мая так заматалася, што я нават хлеба ёй не дала ў дарогу. Нагатавала, а аддаць забыла... Прыязджала яна на юбілей. Стала віншаваць, абдымае мяне, а слёзкі ручаём. І я плачу. Яна мне такая дарагая, мы так добра з ёю жылі... А цяпер адна ў хаце засталася».



— Мама, глядзі ж, сама дровы не нясі. І пасля работы заеду прынясу, — быццам адчуўшы матчыну самоту, наказвае дачка Людміла, якая з'явілася ў дзвярах, а ўбачыўшы нас, дадала: — Наша мама ніколі ні на кога дрэннага слова не сказала, нікога не абгаварыла.

## Мужа шкадавала, а ён мяне любіў

18 гадоў праляцела, як не стала мужа Міхаіла Міхайлавіча. Як вярнуўся ён з арміі, узрадавалася, што хоць і пакалечаны, але з рукамі і нагамі. Шкадавала яго. Калі і вып'е лішку, не крычала: што з п'янага возьмеш?

— Думаю, ранкам насваруся. А раніцай стану казаць, а ён: «Што, не хочаш, каб я еў?» І на гэтым усё.

За мудрасць вельмі паважаў Міхайлавіч жонку. Усім хваліўся: «У мяне Тася — во якая жанчына!» Працаваў Міхаіл Міхайлавіч і трактарыстам, і камбайнерам. Сям'ю трэба было карміць. Але ўсё роўна шмат мужчынскай работы брала на свае плечы жанчына. Не чакала, калі ён надумае дапамагчы, не спадзявалася, сама рабіла ўсё.

— Мішу майго часта запрашалі ў паездкі як інваліда Савецкай Арміі. Іншы раз ён браў мяне з сабою. У Брэсцкай крэпасці я была з ім тры разы. Аднойчы яго паклікалі зноў ехаць на экскурсію, у Белавежскую пушчу, а ў мяне на двары прычэп сена згружаны. Ён паехаў, а я сама тое сена на вышкі перацягала.

— Не крыўдна было?

— На каго крыўдаваць? Дзяцей столькі гадаваць, міленькая, усякае трэба прымаць.

Муж іграў на гармоніку, а яна — на барабане. У «Гарталянцы» спявала, ездзілі на канцэрты і ў Мінск, і ў Баранавічы, і па раёне.

З радасцю ішла Таісія Міхайлаўна на рэпетыцыі ў клуб. Там забывала, што і дзе баліць.

На развітанне юбілярка з сяброўкай і старастай вёскі праспявалі брэндавую песню «Гарталянкі», песню аб тым, што трэба шанаваць жыццё з маладосці. Радкі з яе, глыбокія і працяжныя — «...Дый паедзем даганяці гады ма-а-аладыя...», — здаецца, чую і сёння.

**Валянціна БОБРЫК.**
**Фота Валерыя МІСКЕВІЧА і з архіва сям'і**

■ Юныя геніі

# КАНСТРУКТАР ЗА ТЫСЯЧУ ДОЛАРАЎ І КОД ДЛЯ САБАКІ

## Як першакласнікаў рыхтуюць у прагрworld



**«ІТ-адукацыя для дзяцей ад 6 да 15 гадоў. На курсах школьнікі засвояць праграмаванне, вэб-дызайн, робататэхніку, камп'ютарную графіку. Адкрыты набор на новы навучальны год!» Падобныя аб'явы, расклееныя ў метро, не давалі спакою. Няўжо атрымаць прафесію з заробкам у тысячу долараў можна яшчэ ў малодшых класах? Колькі каштуе выхаваць маленькага праграміста і ці не шкодныя такія заняткі для здароўя дзіцяці — у нашым матэрыяле.**

### Знаёмства з клавіятурай і алгарытмамі

Прапаноў па падрыхтоўцы маленькіх айцішнікаў шмат. І попыт толькі расце. У адной кампаніі, дзе курсы запусцілі ўсяго паўгода таму, расказалі, што хутка збіраюцца пераязджаць. Не хапае месца, каб прыняць усіх ахвотных.

Найчасцей бацькі прыводзяць дзяцей ва ўзросце 6-10 гадоў. І не толькі хлопчыкаў.

— У групе па дызайне ў нас больш дзяўчат, — кажа **Ігар ШАЎЧЭНКА, намеснік дырэктара па вучэбнай частцы Малой акадэміі Адукацыйнага цэнтра Парка высокіх тэхналогій.** — Хлопчыкі ідуць непасрэдна на праграмаванне. Але гэта не значыць, што так павінна быць.

Навучанне пачынаецца з азоў. Малечы, якая пераважна «сядзіць» у смартфоне ці планшэце, паказваюць, як карыстацца камп'ютарам: вадзіць мышшу, набіраць тэкст на клавіятуры, ствараць і капіраваць папкі. Знаёмяць з алгарытмікай. Вучаць такім базавым элементам, як, напрыклад, супастаўленне. Па словах **выкладчыка Аляксандра ФРАНЦКЕВІЧА**, гэтыя навык важны не толькі для будучых праграмістаў:

— Калі ў малодшай школе настаўнік не ўдзяляе ўвагі супастаўленню, то ў старэйшых класах пачынаюцца праблемы. Дзеці не ўмеюць пераносіць веды з геаметрыі і алгебры на фізіку. Думаецца, фізіка — гэта зусім іншая дысцыпліна, і нічога з таго, што вучылі на ўроках раней, нельга прымяніць. Не могуць знайсці косінус вугла ў задачах з рычагом, хоць па матэматыцы гэта ўжо прайшлі.

Заданні па праграмаванні для дзяцей падобныя да гульняў. Персанажу — кату ці сабаку — трэба задаваць пэўныя дзеянні: прайсці два крокі наперад, павярнуць направа, узяць штосьці. Не зробіш праграму — нічога не атрымаецца. Код малыя не пішуць уручную, а складаюць з гатовых блокаў (засвойваюць візуальную мову праграмавання).

— У школьнікаў часта «падаюць» адзнакі, калі яны пачынаюць вывучаць па інфарматыцы «Паскаль». Прычым горш даводзіцца тым, у каго матэматычны склад мыслення. Чаму? «Паскаль» — тэкставая мова праграмавання, там вельмі важна правільна паставіць знакі прыпынку. Гуманітарый коску з кропкай ніколі не прапусціць. Матэматык жа пра іх не думае, яго хвалюе само рашэнне задачы. На курсах дзеці спачатку вучацца алгарытмы выконваць без памылак, а потым ужо на тэкставую мову пераходзяць, — адзначае Аляксандр Францкевіч.



Заняткі праводзяцца не толькі за камп'ютарам. На ўроках па робататэхніцы шмат часу займае зборка канструкцыі. А пры вывучэнні алгарытмаў дзеці спачатку выконваюць заданні ў сшытках.

### «Хачу стаць клаўнэсай»

Падобныя курсы, як, напэўна, і ўсе дзіцячыя гурткі, — выбар бацькоў.

— Усё роўна малыя ў камп'ютары сядзяць, няхай хоць карысць ад гэтага будзе, — кажа Яўгенія, маці 7-гадовага Уладзіка.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Каштуюць курсы нятанна. У залежнасці ад цэнтра, ад 650 тысяч да 1,2 мільёна ў месяц. За навучальны год атрымліваецца да 10 мільёнаў.**

Жанчына распавядае, што яшчэ ў тры гады купілі сыну спецыяльны набор канструктара, за тысячу долараў. «Там спачатку робата збіраеш, а потым задаеш розныя праграмы, каб ён рухаўся». Хлопчык з гэтай задачкай лёгка справіўся. З будучай прафесіяй малога таксама ўжо пазнаёмілі.

— Мы з мужам займаемся арганізацыяй святаў. Праводзілі карпаратывы і для нашых ІТ-кампаній, — дзеліцца Яўгенія. — Я сыну неяк прапанавала схадзіць у адну з іх на экскурсію: «Паглядзім, як дзядзі робяць гульні». Ён, калі ўбачыў, быў у захапленні: «І я так хачу!»

У другакласніка Ягора ўсё таксама пачалося з любові да канструктара.

— А ў 2014 годзе мы выпадкова трапілі на спаборніцтвы па робататэхніцы, — дадае мама Юлія. — На курсы ходзім два разы на тыдзень. Кожны занятак доўжыцца па паўтары гадзіны.

У айцішнікі, праўда, хлопчык не збіраецца. Хоча стаць архітэктарам. «Ужо нават заяўку Дзеду Марозу на наступны Новы год пакінуў, — кажа Юлія. — У «Лега» новы набор выйшаў — «Архітэктура», вось яго замовіў у падарунак».

Увогуле, пра прафесію праграміста тут мараць не ўсе. Сямігадовая Боня прызналася нам, што, калі вырасце, будзе... клаўнэсай.

— Навошта тады ходзіш на камп'ютарныя заняткі?

— А мне падабаецца рабіць робатаў, — усміхаецца малая.

### Паўгадзіны за маніторам — максімум для вучняў малодшых класаў

Арганізатары курсаў адразу папярэджваюць: яны не робяць малых спецыялістамі. Даюцца базавыя веды, якія ў школе атрымаць немагчыма.

— Прагрэс ідзе хутчэй, чым зацвярджаецца школьны план, — каментуе Ігар Шаўчэнка. — Дзеці, напрыклад, дагэтуль вучацца маляваць мульцікі ў «Flash». Нават распрацоўшчык гэтай праграмы ўжо адмовіўся ад яе, бо тэхналогія ўвогуле цяпер не запатрабавана! Лепш бы выкладалі мовы праграмавання. Больш часу адводзілі таму ж «Паскалю».

Каштуюць курсы нятанна. У залежнасці ад цэнтра, ад 650 тысяч да 1,2 мільёна ў месяц. За навучальны год атрымліваецца да 10 мільёнаў. Але ці ёсць сэнс так рана адпраўляць дзіця рыхтавацца да прафесіі?

— Праграмаваць у 6-7 гадоў школьнікі яшчэ не могуць, — упэўнены **дэкан факультэта камп'ютарнага праектавання БДУІР Дзмітрый ЛІХАЧЭЎСКІ.** — Але ў такім узросце не лішнім будзе азнаямленне з камп'ютарнай граматнасцю, каб дзіця ўмела не толькі запусціць гульню. Пачынаць з асновай праграмавання лепш у 11-12 гадоў.

Схільнасць да ІТ-спецыяльнасцяў можна вызначыць па інтарэсе да дакладных навук. Калі з матэматыкай і фізікай з маленства праблем няма, мяркуе Дзмітрый Ліхачэўскі, можна кіравацца ў праграмісты.

Ці не шкодныя такія заняткі для зроку, мы пацікавіліся ў **галоўнага пазаштатнага дзіцячага афтальмолага Міністэрства аховы здароўя Вікторыі КРАСІЛЬНІКАВАЙ.**

— Ёсць санітарныя нормы, — кажа спецыяліст. — Гэта рэкамендацыі па ўзроўні стомленасці мышц вачэй, якія адказваюць за акамадацыю. Школьнікам малодшых класаў можна праводзіць за камп'ютарам ці планшэтам максімум 30 хвілін на дзень. Абавязкова мусіць быць перапынак: напрыклад, 15 хвілін дзіця працуе, паўгадзіны адпачывае. А лепш крыху пазаймацца зранку і потым працягнуць увечары. Падлеткі 14-16 гадоў па 45 хвілін на дзень могуць карыстацца тэхнікай, але таксама з перапынкамі.

Можна працаваць за маніторам і больш, калі прытрымлівацца інтэрвалаў адпачынку. Яны мусяць быць даўжэйшымі, чым між звычайнымі заняткамі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Вазьму твой боль...

# ПРАВА НА ДРУГІ ШАНЦ




**Усе людзі розныя. Немагчыма вынайсці адзіны рэцэпт шчасця. Нельга выпрацаваць аднолькавы падыход да ўсіх. Цяжка прадказаць рэакцыю. Што аднаму добра, тое другому кепска. Асабліва выразна бачу гэта на прыкладзе валанцёрскай дзейнасці ў «Клубе 5000», што дапамагае анкахворым дзецям і іх сем'ям.**

Бацькі з Цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі чытаюць маю калонку. Адна маці кажа: «Што ты пішаш?! Твой боль?! Што можа перажыць валанцёр у параўнанні з нашым, мацярынскім, горам?» А іншая ў асаблівa складаны час для свайго дзіцяці напіша мне: «У тваіх тэкстах столькі ўнутранага болю і адзіноты, мне заўсёды пасля іх хочацца пагаварыць з табой». І абедзве маюць рацыю. Кожная — у меру свайго ўспрымання. Бо ўсе людзі розныя.

Адна маці плача ў тэлефонную трубку, дыктуючы валанцёру патрэбы шматлікага сямейства. Бо сорамна, цяжка прасіць, а тут з малодшым у бальніцу паклалі, пяцёра астатніх да школы не гатовыя. Саромеецца, гаротная — даводзіцца літаральна выцягваць з яе дзіцячыя памеры. Старэйшых, кажа, улетку на падпрацоўку ў калгас адправіла — самі сабе заробяць, іх не запісвайце.

А пра іншую маці прыходзяць такія звесткі: як возіць дачку ў замежную клініку, кідае яе там, а сама па крамах — што бачыць, усё змятае сумкамі. Часу не марнуе — шукае напарніка для фіктыўнага шлюбу, каб застацца ў Еўропе. Хваліцца, што дома мае некалькі машын, кватэр, добры бізнес. А мы ім грошы на лячэнне збіраем.

Мы ўжо сутыкаліся з нядобрасумленнымі бацькамі. Але зноў разгубіліся: што ж рабіць. Паклёп ці карыстанне дабрынёй? Дзе праўду знайсці, як звесткі праверыць? Згадалі адну такую П., што збірала на аперацыю сыну, а патрацілa ў выніку на ўласную карысць. Калегі кажуць, другая такая ж завялася — трэба праверыць яе.

А як праверыць? Не збіраць грошы на замежныя паездкі, не пісаць інфармацыю пра патрэбы? Дык не яна ж пакутаваць будзе — дзіця. Як палічыць яе машыны, кватэры, як праверыць наяўнасць бізнесу і забугорныя пакупкі? Дакументы сабраныя, прадстаўленыя: па іх яна шматдзетная маці без працы. Разлік за паездкі — таксама ў парадку. Дзіця лечыцца.

Усе людзі розныя. І калі нехта паводзіць сябе па-свінску, не адказвай яму тым жа. Мы можам не падтрымліваць хлопчыка ў замежным лячэнні і пры гэтым пакараць яго маці. Але, не маючы канкрэтных фактаў, толькі чуткі, можам памыліцца. Пакінуць дапамогу і даць нажыцца нядобрасумленнай жанчыне таксама будзе памылкай. І з дзвюх памылак я выберу найменшую — другую. Прызнацца, «адмаатаўшы» назад гісторыю са спадарыняй П., я і там нічога не змяніла б — з усіх сіл дапамагала б хлопчыку, маці якога потым набудзе дарагую машыну. Мы не маглі ведаць загадзя, але зрабілі для яго ўсё, што змаглі. Браць на сябе адказнасць за такіх маці немагчыма і загадваць на будучыню таксама. Яна бачыла, што сын згасае і, хутчэй за ўсё, яму не дапамаглі б нават замежныя дактары. Таму, відаць, і прыняла такое рашэнне. Яго апошні шанц (так, адзін з тысячы, але шанц) яна прамяняла на машыну.

Усе людзі розныя. А я веру ў другі шанц — на выпраўленне. І даю яго людзям. Можа, «пераматаўшы» сваю гісторыю назад, наступным разам нават П. зрабіла б інакш.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■

# НЕПРЫДУМАНАЕ КАХАННЕ

## «Беларускамоўны муж — мая смелая мара»

**«З»: Напэўна, прысвячаў вам шмат рамантычных вершаў?..**

**В:** Калі каханне ўзаемнае, вершы не пішуцца.

**Л:** Петрарка пісаў Лауры чаму?.. Таму што яна не ведала пра яго існаванне. Яна была недзе далёка, ідэальная жанчына, а ў яго былі іншыя, нарадзіў нават двух пазашлюбных дзяцей. І маці сваіх дзяцей ён ні радочка не прысвяціў. Нядаўна Віця напісаў некалькі паэм пра каханне: прыдумаў любоў да суседкі — і піша ёй вершаваныя лісты.

**В:** Усё гэта прыдумкі, дробязі. Вершы ад сапраўднага пачуцця часцей за ўсё пуставатыя. Я паказваў новыя творы, але толькі каб пачуць меркаванне, а скарыць — такога жадання не было. Наадварот, страшна: раптам скажа, абы-што напісаў.

**«З»: А калі казаць пра сёння — наколькі пераплеценыя для вас лініі «сям'я» і «творчасць»?**

**В:** Люда можа распавесці ў агульным пра твор, які пішу, але паказвае толькі некалькі ўжо завершаных раздзелаў.

**Л:** Раней, перш чым запісаць новы раздзел рамана, распавядала пра яго дзецям. Так было з «Золатам забытых магіл», «Скокамі смерці», «Пярсцёнкам апошняга імператара», здаецца, і «Сэрцам мармуровага анёла», — пакуль дзеці былі малыя і цярпліва слухалі. Але пераканалася: штосьці ў мяне ні гаварылі ў такіх выпадках, усё роўна зраблю па-свойму.

**«З»: А ці можна сказаць, што вы адно для аднаго не толькі першыя чытачы, але і крытыкі?**

*(у адзін голас)* Так.

**В:** Гаворыцца ўсё як ёсць. Люда заўжды заўважае, дзе падобныя вершы на адну тэму, дзе паўтараецца вобраз ці збіваецца рытм.

**«З»: Вядомыя такія выпадкі, калі адзін у пары ахвяруе сваёю творчасцю на карысць сям'і ці па патрабаванні суджэнца.**

**Л:** Не тыя мы людзі, каб паступацца творчасцю. Мне адпачатку патрэбны быў чалавек, які прыме мяне такую, якая ёсць, з усім, што маю. Але калі першы раз дала Віцю пачытаць вершы, яму не спадабаліся. Так і сказаў: «Харошая ты дзяўчына, але вершаў пісаць не ўмееш». Я раззлавалася і вырашыла давесці зваротнае. Але нашы адносіны развіваліся паралельна. Як не было думкі, што дзеля Віці я мушу пакінуць творчасць, так не было і думкі, што калі чалавеку не спадабаліся мае вершы, я не магу падтрымліваць з ім стасункі. Да ўсяго, у знаёмстве з Віктарам быў для мяне вялікі бонус: з ім я магла размаўляць па-беларуску. То была мая смелая мара — беларускамоўны муж.

**В:** Калі прыгадаць, тваё першыя кнігі склалі вершы, напісаныя пасля нашага знаёмства. А ранейшыя, рускамоўныя, проста зніклі.

**«З»: Атрымліваецца, калі б не Віктар Шніп, не было б і сучаснай Людмілы Рублеўскай. А як наконт «зваротнай сувязі», вашага ўплыву на мужа?**

**Л:** Хто яго пачаў вадзіць па тэатрах? Адкуль узяўся ўвесь інтэлектуальны чыннік у яго творчасці? Дарэчы, Віктар таксама пачаў пісаць якасна новыя вершы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



Сямейная традыцыя Шніпаў — сустракаць Новы год на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску, а затым сядзець каля бронзавых коней, каб увесь наступны год добра падарожнічалася.

**«З»: Калі з'явіліся дзеці, пэўна, стала вельмі мала часу для творчасці?**

**Л:** Чаму ж? Я сядзела дома з Веранікай — і пісала.

**В:** Іншыя заўсёды знаходзяць апраўданне сваёй ляноце.

**«З»: Вашая дачка — мастачка і музыка. Сын Максім навучаецца ў Акадэміі мастацтваў. Як лічыце, гэта іх самастойны выбар ці ўсё ж такі ваш уплыў?**

**Л:** З трох гадоў мы вадзілі іх у выяўленчую студыю ў Нацыянальны мастацкі музей, пасля аддалі вучыцца ў гімназію-каледж мастацтваў. Да ўсяго дзеці бачылі, як я сама малюю. І потым, малых іх заўсёды бралі з сабой: у Дом творчасці, на святы паэзіі... Аднойчы Вераніка нават паехала са мной на канферэнцыю ў Польшчу. Так што, пэўна, і тое, і другое. Але кожны павінен прайсці свой шлях памылак, мы дзяцей ні да чаго не змушаем.

**«З»: На прэзентацыі трэцяй часткі «Авантураў Пранціша Вырвіча» вы сказалі, што падзел працы падчас напісання быў такі: вы пішаце, Віктар Анатолевіч носіць гарбату...**

**В:** Цяпер яшчэ і сабаку кармлю.

**«З»: Калі сур'ёзна: існуе нейкі падзел абавязкаў па бытавой частцы?**

**В:** Я збольшага вару ўсім есці. Хаджу па крамах. Быў час, дранікі раніцай пёк.

**Л:** Калі трэба нешта адрамантаваць, гэта ўжо мая справа. Праводку ў пакой я выводзіла, люстры я вешала, разеткі мяняла. Калі была маленькай, чытала «ТВТ» Янкі Маўра, дзе даводзіцца, што дзяўчынкі могуць што заўгодна.

**«З»: Цікава паглядзець на мужчынскіх і жаночых персанажаў у вашай творчасці. Улюбёны архетып Людмілы Рублеўскай — высокі, хударлявы, чарнявы і змрочны алхімік — мала падобны да Віктара Шніпа. У той жа час Віктар Шніп піша паэмы пра каханне, звяртаючыся да прыдуманай жанчыны. Не ўзнікае на гэтай глебе рэўнасць?**



Вяселле правялі ў рэстаране «Мінск» каля плошчы Незалежнасці. Віктар вельмі дарэчы атрымаў у той час літаратурную прэмію імя Маякоўскага (адзіны беларус з такой прэміяй). 24 ліпеня 1987 года. Злева — сват Мікола Мятліцкі, крайні справа — мастак Алег Карповіч.

**Л:** Не, што ты, наадварот! Мы ж разумеем прыроду пачуццяў да лірычных герояў. Напрыклад, калі я пішу раман ці аповесць, абавязкова закаханая ў героя. Як інакш?..

> У Амстэрдаме, у квартале Чырвоных ліхтароў, адзначалі мае 50 гадоў, прычым Шніп увесь час трымаў мяне за руку, і я вадзіла яго за сабой.

**В:** Гэта ж мастацкі твор. Калі пісаць пра сапраўднае жыццё, давядзецца трымацца нейкіх рамак, а ў выдумцы ты абсалютна вольны, пішы як пішацца.

## «Галоўнае не ставіць матэрыяльныя рэчы вышэй за нематэрыяльныя»

**«З»: Быў час, вы працавалі разам у газеце «Літаратура і мастацтва»...**

**Л:** А цяпер я працую ў «Советской Белоруссии» і не магу напісаць пра Віктара: адразу скажуць, жонка піша пра мужа. Атрымліваецца, шавец без ботаў.

**«З»: А калі наадварот? Як выдаваць кнігі Людмілы Рублеўскай у «Мастацкай літаратуры», дзе Віктар Анатолевіч — галоўны рэдактар?..**

**В:** Каб мне было сорамна перад супрацоўнікамі, што мы выдалі кніжку маёй жонкі, на яе грошы патрацілі, — такога няма. Наадварот, у адзін год выдалі некалькі кніжак — і ўсе разышліся. Гучна гэта прагучыць ці не, на сёння Людміла Рублеўская — адзін з самых вядомых і самых чытаных пісьменнікаў Беларусі. А што яна мая жонка, — што ж тут зробіш?.. Калі мы працавалі ў «ЛіМе», з 1994-га і гадоў дзесяць, нашы кнігі ўвогуле не выдавалі.

**Л:** Пры гэтым набор маёй кнігі рабіўся двойчы, і двойчы яго рассыпалі. Гэта зборнік-прывід, які шмат разоў быў у плане, на які дзяржава выдзяляла грошы, які быў ужо афармлены і зроблены — і дзе ён цяпер, так ніхто і не ведае. У тых варунках мы выдавалі кнігі за свой кошт, часам эканомілі і пад адной вокладкай змяшчалі творы дваіх. У такой сітуацыі многія кідаюць пісаць, а пасля кажуць, былі неспрыяльныя ўмовы. Мы па сваім досведзе можам сказаць, што гэта не спрацоўвае, гэта слабая пазіцыя. Трэба пісаць заўсёды, нават калі цябе не друкуюць і няма ніякіх на тое шанцаў.

**В:** Таксама быў час, калі чамусьці лічылі: друкуем аднаго, значыць, другога нельга. Дурасцікі!.. Што нам цяпер, развесціся?.. Ці наадварот: калі друкуемся ў часопісе, публікацыі нашы абавязкова запіхвалі ў адзін нумар.

**«З»: Можна было б падумаць пра сумесны праект.**

**В:** Была задума напісаць твор удвах. Але што гэта?.. Так, жарты. Рамесніцтва.

**Л:** Разумееш, мы для такіх рэчаў занадта сур'ёзныя як творцы. Калі нешта ствараеш, укладваешся да рэшты — і трошкі больш, твая асоба займае ўсю прастору твора. А абмяжоўваць сябе — была б самадзейнасць.

**«З»: Акрамя літаратурнага жыцця, якое вас паяднала, ці маеце агульнае хобі, захапленне?**

**Л:** Вандравалі па Беларусі, апошнія гады Віктар далучыўся да мяне і ў замежных падарожжах. Тут мы абсалютныя аднадумцы: нам трэба ўсё ўбачыць, усё пагледзець — музеі, храмы, магілкі... Шопінг нас не цікавіць, як і пасядзелкі ў рэстарацыях. Былі разам на Нарачы, у Паланзе, аб'ездзілі ўсю Еўропу, і заўсёды стараемся пабачыць тое, чаго іншыя не бачаць: у Мюнхене збеглі ў пінакатэку, у Амстэрдаме адзіныя з групы пайшлі ў музей Ван Гога, у Бардо не паехалі ў вінадзельню, а блукалі па сярэднявечных кварталах, у Фларэнцыі ўсе пабеглі па крамах — а мы хадзілі па горадзе, і я рыдала — сіндром Стэндаля... У Амстэрдаме, у квартале Чырвоных ліхтароў, адзначалі мае 50 гадоў, прычым Шніп увесь час трымаў мяне за руку, і я вадзіла яго за сабой.

**«З»: Што да сямейных традыцый?..**

**Л:** Сустракаем Новы год на Кастрычніцкай плошчы. Пасля ідзём да ратушы, пасядзець каля бронзавых коней — каб добра падарожнічалася. І абавязкова выглядаю Міхала Валадковіча, прывіда мінскай ратушы.

**«З»: Маючы амаль трыццацігадовы досвед сямейнага жыцця, ці можаце сказаць, як у ім дасягнуць гармоніі, асабліва людзям творчым, якія ў пэўнай меры вымушаны быць эгаістамі?**

**В:** Не быць эгаістамі.

**Л:** У нашым выпадку, напэўна, галоўнае не ставіць матэрыяльныя рэчы вышэй за нематэрыяльныя. Мне здаецца, што большасць праблем сем'яў праз тое і ўзнікае, што чагосьці няма: машыны, ці машына не той маркі, ці кватэра не такая, рамонт не той, трэба нешта купіць, памяняць — і так, у пацучыных гонках, праходзіць усё жыццё. Мы з гэтай гонкі выйшлі даўно. Уласна кажучы, і не ўваходзілі ў яе.

**В:** Што пасля пісьменніка застанецца? Голыя сцены. І шыльда на голай сцяне — «тут жыў». Трэба радавацца таму, што ёсць, і быць шчаслівым, наколькі можна... Альбо прыкінуцца, што шчаслівы.



1996 год. Пісьменніцкая пара з дзецьмі, Максімам і Веранікай (сквер у Грушаўцы).

**Наста ГРЫШЧУК.**
**Фота Надзеі БУЖАН і з сямейнага архіва герояў.**

■ Нататкі таткі



# БАЦЬКІ-КАЗАЧНІКІ

**Вы спрабавалі што-небудзь тлумачыць малым дзецям? Збоку гэты працэс, напэўна, нагадвае лекцыю выкладчыка, які забыў тэму занятку: пачынаеш адно, але паралельна вымушаны патлумачыць яшчэ шмат сумежных паняццяў. Пры гэтым неабходна выкарыстоўваць абмежаваны слоўнікавы запас, бо аўдыторыя яшчэ не вельмі дасведчаная, але да ведаў цягнецца прагна. Складаней за ўсё, калі гаворка ідзе пра недапушчальнасць пэўных паводзін. У такіх выпадках пачынаеш дзякаваць усім аўтарам павучальных дзіцячых твораў, ды і сам, хочаш не хочаш, ператвараешся ў казачніка.**

Мне заўсёды здавалася, што павага і любоў да бацькоў закладзены на генетычным узроўні. Напрыклад, у нашай сям'і усе дзеці з маленства ведалі, што нельга крыўдзіць маму і тату. І гэтыя веды перадаваліся ад дарослых да малодшых, мы проста раслі і пераймалі адпаведную мадэль паводзін. Я нават ніколі не задумваўся, што нехта яе сфарміраваў і адрэгуляваў, што яна не ўзнікла сама па сабе. Безумоўна, гэтым чалавекам была маці, але яна рабіла гэта неяк асцярожна і незаўважна. Памятаю, аднойчы мне падарылі пісталецік. І вось падчас гульні я нацэліў яго на матулю. Я нават не паспеў зрабіць «піф-паф», як яна падышла, лагодна паклала руку на пісталет і апусціла яго. Потым паглядзела ў вочы і сказала: «А калі ён раптам стрэліць? І мамы не стане?». Я запярэчыў, што гэта цацка, а яна з усмешкай сказала: «Адзін раз на год і палка страляе». Тады мне гэта здалося простым нежаданнем гуляць са мной, я пакрыўдзіўся, але зрабіў адпаведныя высновы і больш так не жартаваў.

Некалькі месяцаў таму ў нас, маладых бацькоў, узнікла невялікая праблема з паводзінамі дачушкі. Малая пачала біцца. Часам яна рабіла гэта жартам, а часам выкарыстоўвала такі прыём, калі ёй штонебудзь не падабалася. Адным словам, у наш адрас часценька прыляталі аплявухі. «Балазе, яна не разабралася, што ў ход можна пусціць і зубы», — спачатку жартавалі мы з жонкай. Ні тлумачэнні, ні пакаранні ў выглядзе пазбаўлення ад салодкага, ні крыўды — нічога не дапамагала. Яна рэагавала на заўвагі, спачатку шкадавала, абяцала, што больш не будзе, а потым, пры першай жа нагодзе, усё паўтаралася. Безумоўна, Васіліса ў свае няпоўныя два гады не магла ўдарыць балюча, але справа была ў іншым.

Вырашыць гэтую праблему дапамаглі казкі. Наша Васіліса вельмі любіць слухаць гісторыі пра прыгоды маленькай дзяўчынкі, яе бабулі і дзядулі на лецішчы. Іх яна просіць кожны вечар перад сном. Падчас аповеду ніхто не агучвае, што гэтая дзяўчынка — Васіліса, але яна дакладна разумее, што гаворка ідзе пра яе. Дык вось, аднойчы вечарам дачка чарговы раз паказала мне свой характар аплявухай. Гэта падштурхнула да нараджэння адпаведнай гісторыі. Па тэксту дзяўчынка прыехала да дзеда з бабай на лецішча і пачала іх крыўдзіць: біцца і драпацца. Пра гэта вельмі хутка даведаўся Мышыны кароль, які сам некалі быў гарэзлівым хлопчыкам, але яго зачаравала злая фея менавіта за такія непрыстойныя паводзіны. З таго часу Мышыны кароль вышуквае шкадлівых дзяцей, ператварае іх у мышэй і забірае да сябе ў цёмную нару, каб сябраваць і разам рабіць дрэнныя ўчынкі. І вось той Мышыны кароль паслаў сваіх служак, каб яны прывялі дзяўчынку да яго. Але бабуля і дзядуля не далі ім гэта зрабіць, прапанаваўшы ў якасці выкупу ўсе ласункі, што былі ў доме. Маленькая ж дзяўчынка пачула, як яны вялі перамовы з мышамі, і вырашыла, што больш ніколі не будзе крыўдзіць блізкіх. Так з таго часу і было, ад чаго яе ўсе сталі любіць яшчэ больш.

Пасля гэтай гісторыі дачка перастала біцца. Іншы раз і нас, бацькоў, выхоўвае. Напрыклад, аднойчы яна непаслухмяна вяла сябе за сталом. Зрабіў заўвагу, калі яна не адрэагавала, паўтарыў — зноў няма рэакцыі. Давялося сказаць, што хтосьці зараз заробіць лупцака. Васіліса адрэагавала імгненна, але не так, як я чакаў.

— Тата, не гавары так, а то па цябе прыйдзе Мышыны кароль, — зрабіла мне сустрэчную заўвагу дачка.

Контраргументу ў мяне не знайшлося, але ў той жа вечар прагучала гісторыя пра дзяўчынку, якая не ўмела паводзіць сябе за сталом. Ёсць у нас казкі пра капрызную плаксу, жмінду, непаслухмяную дзяўчынку — усё гэта добрыя павучальныя гісторыі, якія нараджаюцца ў залежнасці ад паводзін малой. Дачка заўсёды слухае іх з цікавасцю і часцей за ўсё карэктуе свае паводзіны. Калі так адбылося, то потым яна абавязкова папросіць паўтарыць адпаведны аповед, каб удакладніць, што Васіліса ТАК ужо не робіць. Выходзіць, што кожны вечар мы дорым казкі ёй, а яна штоімгненне — нам.

**Аляксандр АЛЕСІК.**

■ Справа жыцця

# ЛЁГКІХ ВАМ КРЫЖЫКАЎ

**У былыя часы не існавала такой дзяўчыны, якая не магла б вышываць. Бо зрабіць самой сабе пасаг было справай гонару. Сорамна прызнацца, але для мяне веданне гэтага рамяства да нядаўняга часу абмяжоўвалася адным крыжыкам. Народны майстар Беларусі Галіна РУДНІЦКАЯ хутка выправіла гэты прабел.**



Ахвотных навучыцца вышываць на Магілёўшчыне нямала.

## З ІНЖЫНЕРА-МЕТАЛУРГА — У ВЫШЫВАЛЬШЧЫЦЫ

Сама Галіна Рудніцкая ў свой час у жаданні дасягнуць дасканаласці не саромелася звяртацца да самых аўтарытэтных настаўнікаў. Яшчэ ў пачатку сваёй творчай кар'еры брала парады ў вялікага знаўца народных рамёстваў Яўгена Міхайлавіча Сахуты. Дарэчы, да таго, як крута павярнуць сваё жыццё і стаць майстрыхай, яна была паспяховым інжынерам-металургам. А на спецыяльнасць «народныя рамёствы» ў інстытут паступіла ў 42 гады. Вучылася ў Зінаіды Зіміной, якая разам з Вольгай Лабачэўскай з'яўляецца аўтарам кнігі пра беларускі народны касцюм.

— Крыжыкам я вышываць умела і прыйшла да Зінаіды Іванаўны на першыя заняткі з упэўненасцю, што я ўжо ўсё ведаю, — усміхаецца яна. — Але хутка зразумела, што нічога не ведаю, нічога не ўмею, мне трэба закрыць рот і вучыцца. Бо тут такое багацце, такая разнастайнасць. І гэта пры тым, што давалі нам, завочнікам, не так і шмат. Але ў завочнай адукацыі ёсць плюс. Калі ты чагосьці хочаш, ты таго выкладчыка дастанеш. А я вельмі прагла ведаў.



Вышыўка Галіны Рудніцкай.

Спачатку яна перарабіла ўсе тыя швы, што знайшла ў кнізе сваёй настаўніцы «Беларускі народны касцюм: крой, вышыўка і дэкаратыўныя швы». Потым адправілася шукаць па музеях тыя, што не ўвайшлі ў кнігу. І не перастае здзіўляцца таму, колькі іх яшчэ існуе. Яе знаёмы выкладчык па вышыўцы з Кіева кажа, што ў прыродзе існуе каля 800 швоў. Рудніцкая ведае пакуль 200.

## І ПАЧАЛА КАЛЕКЦЫЯНАВАЦЬ ШВЫ

Яна дэманструе альбом са швамі, характэрнымі для Магілёўшчыны. Калекцыя ўражвае.

— Я нават дакладна не ведаю, колькі іх у мяне, бо не перастаю знаходзіць нешта новае. Пакуль складваю па геаграфічным прынцыпе і музеях. Потым буду сістэматызаваць па тэхніках і варыянтах. У адным вырабе можа сустракацца да 15 швоў, — кажа яна.

Майстрыха перажывае, што паступова знікаюць складаныя тэхнікі, працаёмкія. Напрыклад, злучальныя швы, дзе трэба нацягваць ніткі, потым іх пераплятаць, навязваць вузельчыкі. Вельмі шмат выпадкаў, калі ў даваенных і пасляваенных кашулях на тым самым месцы, дзе павінна быць злучальнае шво, — такога ж малюнку ромбікі, вышытыя крыжыкам. Гэта ўжо імітацыя. Галіна Рудніцкая старанна вышуквае ў музеях рэдкія швы, каб зафіксаваць іх на фота і запісаць, як яны робіцца.

Вышыўка як народнае рамяство існуе даўно, але старадаўнія ўзоры — вялікая рэдкасць. Спецыялісты сведчаць, што нават з рэчаў XIX стагоддзя ў нас амаль нічога няма. На пачатку XX стагоддзя яны збіраліся этнографамі і вывозіліся ў Пецярбург. Таму калекцыі там як мінімум на стагоддзе старэйшыя за нашы. «Вось толькі дабрацца да іх складана, — уздыхае Галіна Рудніцкая. — Даведалася, што ў пецярбургскім музеі ёсць касцюм з вёскі Лудчыцы Быхаўскага раёна. Хацелася паглядзець. Загадчыца музея дазволіла, а вось захавальніца адмовіла. Паленавалася шукаць яго ў сховішчах. Там стольскі сабрана ўсякага вышыванага дабра, што, як мне здаецца, да беларускага ў іх наогул ніколі рукі не дойдуць. А ў Кракаве зусім іншы падыход быў. Прыехала туды са сваімі вучаніцамі паглядзець беларускі матэрыял, дык нам два чалавекі тры дні займаліся. Завялі ў сховішчы, і мы там усё, што можна было, рукамі перабралі, швы пералічылі і сфатаграфавалі. Вельмі нам спадабалася тамтэйшае стаўленне.

У беларускіх музеях таксама хапае цікавага. І Магілёўшчына не выключэнне. Асабліва майстрыху захапіла калекцыя Касцюковіцкага раёна. Там вельмі прыгожыя кашулі, ручнікі. Тэхнікі таксама разнастайныя. Шмат лічанай гладзі, прыгожыя ўзоры процягам, цікавыя злучальныя швы. «Бывае, глядзіш на кашулю, нічога асаблівага, але адна маленькая дэталь настолькі прыгожая і цікавая, што ўжо толькі дзеля гэтага трэба прыехаць», — кажа Рудніцкая.

**«Даведалася, што ў пецярбургскім музеі ёсць касцюм з вёскі Лудчыцы Быхаўскага раёна. Хацелася паглядзець. Загадчыца музея дазволіла, а вось захавальніца адмовіла. Паленавалася шукаць яго ў сховішчах».**

Вось што яе засмучае, дык гэта вялікае «засілле» крыжыка. Знаўцы называюць такія працы «карцінкамі» і лічаць, што гэта дэвальвацыя мастацтва. Усе гэтыя ружачкі, Алёнушкі, Іваны-царэвічы, зробленыя крыжыкам у пачатку і сярэдзіне XX стагоддзя, вялікай каштоўнасці не ўяўляюць.

## НАПЕРАД ІГОЛКУ — ГЭТА ПРОСТА!

Іголка, ніткі, канва, нажніцы — вось прыклады набор «маладой» вышывальшчыцы. Але спачатку ўводзіны ў прафесію.

— Першыя швы, якія я даю, — аздобныя (Сахута называе іх аздабляльныя), — пачынае Рудніцкая практычны ўрок. — Швы, якія не выкарыстоўваюцца асобна, называюцца простыя, а ў спалучэнні з рознымі тэхнікамі — дапаможныя. Асноўная традыцыйная тэхніка — процяг. Шво «наперад іголку» — самы просты від шва. Іншая тэхніка — лічаная гладзь, калі вышываюцца асобныя матывы — кветачкі, зорачкі і гэтак далей. У нас, дарэчы, вельмі шмат лічанай гладзі. Роспіс у асноўным прымяняецца на Віцебшчыне. Далей — крыжык, ён павінен выглядаць справа і злева аднолькава. У гэтых тэхніках выканана асноўная маса нашых традыцыйных вырабаў. Яшчэ сустракаюцца мярэжкі, але не часта.

Калі гучыць прапанова браць у рукі іголку, далучаюся да астатніх майстрых. Але хутка разумею, што пакуль не хапае ўседлівасці і ўважлівасці. З непрывычкі або прапускаю клеткі на канве, або бяру на адну далей. І арнамент скажаецца.

— Некаторыя прыязджалі да мяне ў Мінск з Віцебска і з Лунінца. Вышывалі крыжыкам карцінкі, і ім надакучыла — захацелася большага, — падбадзёрыла Галіна Рудніцкая. — Калі пастараецца, абавязкова атрымаецца!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара**



Вось такія цуды выходзяць з-пад «іголкі» народнага майстра.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

**Организатор аукциона и продавец имущества:**

**открытое акционерное общество «Дорожно-строительное управление №1 , г. Рогачев»,**

*ул. Генерала Петровского, 1, т. 8(023339) 2-55-37.*

**Аукцион проводится 22 марта 2016 года в 11.00 по адресу: г. Рогачев, ул. Генерала Петровского, 1, актовый зал (3-й этаж).**

**Сведения о предмете аукциона**: Имущество находится в собственности ОАО «ДСУ-1, г. Рогачев»:

## бывший в эксплуатации технически неисправный легковой автомобиль ПЕЖО 607,

**2002 года выпуска, кузов № VF39DXFXB92071003, цвета сребристый металлик, регистрационный знак 1070 АЕ-3.**

Продается методом повышения начальной цены.

**Место нахождения имущества:** г. Рогачев Гомельской области, ул. Генерала Петровского, 1.

**Начальная цена имущества с учетом понижения на 50%: 29 674 800 рублей с НДС.**

**Задаток для участия в аукционе (рублей): 1 483 740 рублей.**

**Сумма задатка, внесенная покупателем, засчитывается в цену продажи.**

**Шаг аукционных торгов составляет 5%.**

Осмотреть имущество и ознакомиться с его техническим состоянием можно по адресу: 247671, г. Рогачев, ул. Генерала Петровского, 1 с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни.

*Задаток перечисляется на расчетный счет ОАО «ДСУ-1, г. Рогачев» №3012115070013 в ЦБУ №320 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Рогачев, ул. Ленина, 69, бик 153001369, УНП 400041344.*

Заявления (с прилагаемыми документами) на участие в аукционе принимаются по адресу: **247671, г. Рогачев, ул. Генерала Петровского, 1**, приемная генерального директора с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни**, прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 марта 2016 года в 17.00.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. заявление на участие в аукционе и соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, подписанное директором ОАО по установленной форме;

2. документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

3. юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

4. иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык;

5. иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык;

6. представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан**: подписать протокол аукциона; в течение 3 рабочих дней после утверждения протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с оценкой объекта аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с продавцом имущества договор купли-продажи автомобиля. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 2 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до его проведения.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот №1. Станок сеткоплетельный СПМ-2МА-01, заводской номер 0025, дата выпуска 12.2014. Первоначальная стоимость – 68 000 000 рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧТУП «Слававтосити», УНП 391120905 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, Оршанский район, д. Андреевщина, пер. Парковый, 7 |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 2<br>09 марта 2016 года в 14.00 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши<br>211391, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Судебный исполнитель – Слепцова Елена Алексеевна,<br>тел. 80216543204 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в повторных торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 300002505, **не позднее 05.03.2016 г.**<br>Величина шага торгов – не менее 5% начальной стоимости выставленного на торги лота.<br>В соответствии с ч.3 ст. 401 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу серии БА № 0429856-0429857, № 0507633 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным в связи с утерей.**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т.ч. ограничения и условия в его использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **б-р Космонавтов** | 1029524 | 0,0141 | строительство и обслуживание (пристроенного) объекта оказания бытовых услуг и торгово-офисного назначения | 10 | **61 877 898** | 12 370 000 | **20 273 957** | 0,0038 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 2 | **пр-т Республики (р-н АЗС №85 «Белнефтехим»)** | 1029525 | 0,3184 | строительство и обслуживание бесконтактной автомобильной мойки | 10 | **262 777 437** | 52 550 000 | **24 022 589** | ограничений в использовании земель нет |
| 3 | **ул. Богданчука** | 1029508 | 0,6748 | строительство многоквартирного жилого дома | 5 | **996 757 166** | 199 350 000 | **53 067 474** | 0,6748 га – водоохраная зона реки Мухавец;<br>0,0132 га – охранная зона сетей и сооружений канализации;<br>0,1064 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения;<br>0,0525 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В;<br>0,0155 га – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В |
| 4 | **ул. Коммерческая, 14** | 1029509 | 0,0935 | строительство и обслуживание физкультурно-оздоровительного объекта общественного назначения (фитнес салона) | 10 | **155 005 614** | 31 000 000 | **20 429 555** | 0,0025 га – охранная зона подземной кабельной линии электропередачи напряжением до 1000 В |
| 5 | **ул. Орджоникидзе** | 1029510 | 0,0008 | установка и обслуживание торгового павильона | 10 | **3 588 945** | 710 000 | **10 827 467** | ограничений в использовании земель нет |

**Дополнительные условия для победителя аукциона:**

**по лоту №1:** в установленном порядке осуществить устройство шумозащитного ограждения между границами санитарно-защитной зоны цеха №2 по ул. Карбышева, 92 в г. Бресте и жилым домом по ул. Карбышева, 84 в г. Бресте;

**по лоту №2:** в установленном порядке обеспечить организацию транспортных потоков с возможностью заезда на АЗС и мойку без выезда на разворот на пр-т Республики;

**по лоту №4:** до осуществления государственной регистрации возникновения права на земельный участок возместить на транзитный расчетный счет, открытый главному управлению Министерства финансов Республики Беларусь по месту постановки на учет предприятия (назначение платежа 05201), потери сельскохозяйственного производства в сумме 14 848 000 рублей, связанные с изъятием 0,0939 га сельскохозяйственных земель для последующего использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства;

**по лотам №№ 1–5:** обеспечить содержание приобретенного земельного участка в надлежащем санитарном и техническом состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста).

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».**

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале №100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке), возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. №881;

• в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;

• в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;

• приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения), при этом срок подготовки проектной документации на строительство объекта с учетом ее государственной экспертизы не должен превышать два года.

**Аукцион состоится 31 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 25.02.2016 г. до 17.30 25.03.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан и негосударственных юридических лиц Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка | Кадастровый № 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т.ч. ограничения и условия в его использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **ул. Павловская, 5** | 1029511 | 0,1003 | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | **161 336 412** | 32 260 000 | **14 498 408** | ограничений в использовании земель нет |
| 2 | **ул. Снежная, 15** | 1029512 | 0,0937 | | **170 154 468** | 34 030 000 | **14 498 408** | 0,0937 га – охранная зона мелиорированных земель |
| 3 | **ул. Заветная, 10** | 1029513 | 0,1500 | | **311 116 500** | 62 220 000 | **13 357 226** | 0,0036 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 0,4 кВ |
| 4 | **ул. Лейтенанта Рябцева, 84/3** | 1029515 | 0,1082 | | **308 695 087** | 61 730 000 | **11 867 982** | 0,0077 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 0,4 кВ |
| 5 | **ул. Ракитная, 6** | 1029518 | 0,0680 | строительство и обслуживание блокированного жилого дома | **98 727 636** | 19 740 000 | **13 296 579** | 0,0680 га – охранная зона мелиорированных земель;<br>0,0008 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 0,4 кВ;<br>0,0119 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ |
| 6 | **ул. Ракитная, 6/1** | 1029519 | 0,0684 | | **99 308 387** | 19 860 000 | **12 986 579** | 0,0684 га – охранная зона мелиорированных земель;<br>0,0008 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 0,4 кВ;<br>0,0122 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ на площади |
| 7 | **ул. Вересковая (4 земельных участка общей площадью 3,5552 га)** | 1029520 | 0,9120 | строительство и обслуживание блокированных жилых домов | **11 298 849 263** | 2 259 760 000 | **128 016 444** | 0,2300 га – охранная зона мелиорированных земель |
| | | 1029521 | 0,8784 | | | | | 0,3800 га – охранная зона мелиорированных земель;<br>0,0310 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| | | 1029522 | 0,9177 | | | | | 0,0032 га – охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В |
| | | 1029523 | 0,8471 | | | | | 0,0300 га – охранная зона газопровода среднего давления |

**Дополнительное условие для победителя аукциона по лотам №№2, 5 и 6: осуществить** возмещение убытков, причиненных нарушением функционирования мелиоративных сетей и сооружений по ул. Снежной, 15 в размере 5 509 560 рублей, по ул. Ракитной, 6 в размере 3 998 400 рублей и по ул. Ракитной, 6/1 в размере 4 021 920 рублей.

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №3012780360011 в филиале №100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке), возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. №881;

• в течение 2 месяцев со дня получения выписки из решения горисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;

• получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство объекта;

• приступить к освоению земельного участка в течение шести месяцев (для юридических лиц) и в течение одного года (для граждан) со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство), при этом срок подготовки проектной документации на строительство объекта с учетом ее государственной экспертизы не должен превышать два года;

• снять на занимаемом земельном участке плодородный слой и использовать его согласно проектной документации;

• обеспечить содержание приобретенного земельного участка в надлежащем санитарном и техническом состоянии (самостоятельно или путем заключения договора со специализированной организацией г. Бреста).

**Аукцион состоится 31 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3 (каб. 607).**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 25.02.2016 г. до 17.30 25.03.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

■ Уласны досвед

# НЕ ГУБЛЯЙЦЕ ПЛЕЧУКІ!

## Як даглядаць «складанае» адзенне і мэблю

**Штодня апранацца «з іголачкі», выглядаць ахайна, прадстаўніча і пры гэтым не выдаткоўваць «шалёныя» сумы на новае адзенне і не атрымліваць рахункі з хімчысткі, якія палохаюць лічбамі... Пры жаданні гэта магчыма. Дастаткова паставіць перад сабой мэту і прыслухацца да парад руплівых гаспадынь.**

**Мая суразмоўца Ларыса — маці хлопца-падлетка, вопратка якога павінна адпавядаць максімалісцкім запатрабаванням узросту, і 4-гадовай дзяўчынкі, якую яна лічыць за лепшае адзяваць у асляпляльна белыя рэчы са стразікамі. Гэта ўжо не кажучы пра неабходнасць падтрымліваць стыльны вобраз мужа і даглядаць уласны гардэроб, які штодня ацэньваюць калегі ў жаночым калектыве.**

### Пух без пер'я ў пральнай машыне

Самая складаная частка гардэроба — вопратка накшталт кажуха або паліто, прывесці ў парадак якія ў хатніх умовах немагчыма. Але ж некаторыя вялікія рэчы можна пачысціць і дома, напрыклад сінтэпонавыя курткі і пухавікі. Іх лепш мыць у пральнай машыне па адной.

*— Зімнюю вопратку я проста накідваю левым бокам на паверхню гарачай батарэі і сушу,* — распавядае Ларыса. *— Прасую курткі праз марлю. У пухавіку перад гэтым пух, які збіўся ў камяк у адным месцы, тармашу і рассоўваю па ўсёй куртцы. Пасля праса рэч зноў становіцца аб'ёмнай і нават нібы мякчэйшай.*

Каб зразумець эканамічную выгаду ад мыцця вопраткі дома, трэба ўяўляць, колькі разоў за сезон яно спатрэбіцца курткам. Цёмным — магчыма, і адзін, а вось светлым — штотыднёва. Чысціня пухавіка даўжынёю да 70 см абыдзецца ў 240 000. Пачысціць паўпаліто або падоўжаную куртку (76-90 см) у адной з дзяржаўных хімчыстак каштуе 250 000, а калі заказаць паслугу з аднаўленнем вырабу — гэта амаль 600 000. І гэта, умоўна, разавыя за сезон працэдуры. Догляд жа светлай рэчы абыдзецца ў 3-4 мільёны: памножце чатыры тыдні на 250 000 і яшчэ на 3-4 месяцы.

Аператар прыёмнага пункта дзяржаўнай хімчысткі Тамара адзначыла, што людзі прыносяць у чыстку самыя розныя рэчы, у тым ліку і пухавікі:

*— Некаторыя прыносяць рэчы з рагамі пасля няўдалага мыцця дома або са зваленым у камякі пухам, які ў нас разбіваецца па ўсёй куртцы ў спецыяльнай машыне тэніснымі шарыкамі.*

### Мыць і прасаваць — навыварат

Гарнітуры гаспадыня таксама мые дома, прычым не толькі хлапечыя, а і «дарослыя» — мужа.

*— Перш чым пакласці рэч у пральную машыну, падумайце, як вы будзеце яе прасаваць,* — раіць яна. *— Ці зможаце зрабіць гэта так, каб адзенне прыняло тую ж форму, як да мыцця. Прасаваць, напрыклад, мужчынскі пінжак, досыць складана, трэба напрактыкавацца.*

Галоўная задача пры мыцці пінжака — не згубіць плечукі, інакш рэч страціць форму. Перад засоўваннем у пральную машыну пінжак трэба вывернуць і шчыльна ўкласці плечукі адзін у другі. Пасля рэч складаецца ўдвая і засоўваецца ў мяшок з такім разлікам, каб пінжаку ў ім было не надта цесна (парашок павінен выпаласкацца з тканіны), але і не надта свабодна (не трэба, каб пінжак біўся ва ўсе бакі, асабліва ў рэжыме адціскання). Зыходзячы з гэтага трэба выбіраць і памер мяшка, і колькасць рэчаў у ім. За адзін раз лепш мыць у мяшку пінжак і штаны, а ў барабан укладаць яшчэ тры-чатыры рэчы, каб не было цесна. Мяшок з гарнітурам, дарэчы, лепш завязаць, каб адзенне не выпала. Сушыцца пінжак на вешалцы, прасуецца звычайна з левага боку, а звонку — праз марлю і вельмі акуратна.

У хімчыстцы пінжак апрацаюць за 140 000, штаны — за 120 000. Дарэчы, можна заказаць тут толькі прасаванне, без мыцця — каштуе яно 60% ад цаны на мыццё адпаведнай рэчы. Некаторыя так і робяць.

*— Я маю чатыры гарнітуры і раз на год карыстаюся паслугамі хімчысткі,* — расказаў мінчанін Вадзім, які прыйшоў забраць свае тры касцюмы і аддаць на мыццё апошні. *— Тым больш што тут рэчы адпрасуюць як след. Ведаю людзей, якія толькі дзеля гэтага ў хімчыстку і ходзяць, напрыклад «навесці стрэлкі» на штанах. Думаю яшчэ паспрабаваць аддаваць у хімчыстку дываны, бо цяпер магчыма паслуга, што іх забяруць і вернуць самі работнікі.*

### Трыкатажная дэфармацыя

Ларыса ведае падыход і да далікатных трыкатажных рэчаў. Каб світар пасля мыцця ў машынцы не ператварыўся ў сукенку, трэба таксама класці яго ў мех.

*— Трыкатажныя рэчы ў юнацтве я, пэўна, як і ўсе, мыла ўручную. Пасля раскладвала іх на анучцы па падлозе, каб вада ўвабралася ў тканіну, і толькі потым вешала сохнуць. Тым не менш пад цяжарам вады рэчы ўсё роўна правісалі і хутка гублялі выгляд. Акрамя таго, як бы далікатна вы ні цiскалі адзежу рукамі, каб мыццё было беражлівым, рэчы ўсё роўна пашкоджваюцца такім чынам больш, чым у машынцы,* — успамінае Ларыса. *— Цяпер я кладу трыкатаж у мяшок або навалачку такім чынам, каб рэчам было і свабодна, і каб яны не расцягваліся. Сушу світары на батарэі, папярэдне склаўшы іх рукавы і каўняры і склаўшы ўдвая — атрымліваецца кампактны скрутак, які не расцягнецца.*

Калі рэчы пацярпела ад «ручнога мыйнага гвалту», яе таксама можна рэанімаваць у хімчыстцы, заплаціўшы крыху больш за 70 000. Працэдура так і называецца: «Вяртанне памераў і формаў трыкатажным вырабам, дэфармаваным пасля мыцця ў хатніх умовах».

У некаторых пытаннях мая суразмоўца застаецца прыхільніцай класікі і дзеля ідэальнай чысціні і прывабнага выгляду заўсёды кіпяціць дзіцячыя майкі і трусы. Яна ўпэўнена, што кіпячэнне з адбельвальнікам бабуліным метадам не заменіць ніякі навамодны парашок.



Акуратна выпростваем абодва плечукі, адначасова выварочваючы пінжак.



Шчыльна ўкладаем адзін плячук у другі.



Канчаткова складваем пінжак на левы бок.



Складваем пасярэдзіне і змяшчаем у мех.



Каб рэч не выпала, завязваем гарлавіну мяшка.

### Парады ад гаспадыні:

✓ **Перш чым класці рэч у пральную машыну, падумайце, ці зможаце вы яе адпрасаваць.**

✓ **Праць у машынцы можна толькі адзенне, у якое дабаўлены ненатуральныя ніткі. Напрыклад, стапрацэнтна шарсцяны касцюм туды кідаць нельга.**

✓ **Рэжым для мыцця лепш абіраць беражлівы, аднак адціскание павінна быць немаленькім — 600-700 абаротаў.**

✓ **«Складаныя» або далікатныя рэчы трэба правільна скласці і для мыцця, і для сушкі, а ў пральную машыну ўкладаць у мяшочках.**

✓ **Сродак для мыцця лепш браць вадкі, каб на рэчах не заставалася белых слядоў ці плям ад крупінак.**



Кладзем у пральную машыну.

### Дыван на плоце

Сэканоміць можна таксама і на чыстцы дывана.

*— Акрамя зімовага снежнага выбівання, наладжвайце яму летнюю чыстку на прыродзе: у вёсцы ці на дачы,* — раіць гаспадыня. *— Раскладваеце дыван на траве, шчодра намочваеце вадою і намыльваеце кавалкам гаспадарчага мыла (не мыйце дыван парашком!). Пасля шорсткай шчоткай шаруеце і чысціце ворс. Змываеце пену не менш як разоў 8. Можна паліваць дыван з вядра і зганяць мыльную ваду да краёў, шчыльна прыціскаючы драўляны бок шчоткі да паверхні вырабу. Калі ёсць шланг — палівайце фантанам, пакуль не скончацца мыльныя ручаі.*

Пасля дыван складваецца ўдвая ўздоўж (пена змываецца з левага боку), яшчэ раз складваецца пасярэдзіне і ставіцца вертыкальна, каб сцякла вада, або закідваецца на плот. Каб дыван добра і хутка сох, трэба мыць яго ў спякотнае надвор'е.

Мінімальная сума, якую ўдасца захаваць пры самастойным мыцці дывана, — 300 000 (самы танны абавязковы заказ на паслугі «клінінгавых» спецыялістаў, якія ўдалося адшукаць у сталіцы). Рэнтабельнасць выезду да кліента прадстаўнікоў іншых кампаній вар'іруецца ад набору паслуг на 450 тысяч і нават на 800. Гэта можа быць мыццё не толькі дывана, але і вокнаў, жалюзі, радыятараў, мэблі, прыборка пасля рамонту, затаплення і іншыя паслугі.

Вільготнае мыццё кожнага дываннага метра каштуе ад 30-40 да 65 тысяч у прыватных кампаніях (дыван забяруць-прывязуць або зробяць усё у вашай вкатэры) і ад 55-ці — у дзяржаўнай хімчыстцы (сюды дыван трэба прывозіць і забіраць самому).

Цікава, што інфармацыя пра магчымасці паслугі і тэрміны наступнага карыстання вырабамі таксама адрозніваецца. Адны сцвярджаюць, што мыць дыван на пакрыцці з ламінату ці паркету катэгарычна забаронена, другія — што матэрыял падлогі не мае значэння. Час, патрэбны, каб дыван пасля мыцця высах, вымяраецца тэрмінам ад 10 гадзін да сутак.

### Канапа пад парай

Плямы ад соку, тлушчу, малюнкі алоўкамі і фламастарамі на мэблі таксама можна вывесці самастойна, лічыць Ларыса. Яна змагаецца з брудам з дапамогай гаспадарчага мыла і анучкі з мікрафібры. Паверхня канапы або крэсла праціраецца намыленай анучкай, пасля чаго ёй жа здымаецца пена. *«Галоўнае — не даць канапе зашмат вільгаці, якая ўбярэцца ў паралон»,* — кажа Ларыса.

Між тым іншая гаспадыня сцвярджае, што яна карыстаецца для выдалення плямін з канапы звычайным сродкам для чысткі, які ўспеньвае шорсткай губкай. Мэбля пры гэтым намочваецца досыць моцна, але ж праз дзень яна цалкам высыхае.

Самастойнае мыццё мяккай мэблі сэканоміць у сямейным бюджэце адчувальную суму. Прыстойны выгляд крэсла запатрабуе ад 120 да 170 тысяч, чыстка двухмеснай канапы абыдзецца ў 250-300 тысяч, трох- і чатырохмеснай — у 350 і 450 тысяч адпаведна. І гэта яшчэ не канчатковы кошт. Калі патрабуецца апрацоўка парай, выдаленне паху і іншыя працэдуры, цана павышаецца. Карыстацца памытай мэбляй можна, па звестках адных кампаній, праз 6-12 гадзін, іншыя фірмы не рэкамендуюць спаць на канапе суткі.

Як і на чым эканоміць, кожны вырашае самастойна. Галоўнае — не пазбавіць рэчы якасці.

**Ірына СІДАРОК. Фота аўтара**

## АДБЕЛЬВАЕМ ГАРДЗІНЫ

**Што рабіць, калі любімыя гардзіны пажаўцелі? Прапануем пяць простых парад для мыцця, пасля чаго вашы пажаўцелыя занавескі набудуць беласнежны выгляд.**

**1.** Перад мыццём абавязкова старанна вытрасіце занавескі, каб пыл і бруд, якія на іх назбіраліся за зіму, не ўеліся ў тканіну падчас замочвання.

**2.** Моцна забруджаныя гардзіны замачыце на 5-6 гадзін у гарачай вадзе з канцэнтраваным растворам солі: 4 сталовыя лыжкі на 5 літраў вады.

**3.** Мыйце цюль пры далікатным рэжыме ў пральнай машыне. Для дадатковага адбельвання дабаўце ў пральную машыну 1 сталовую лыжку кіслароднага адбельвальніка БОС. Гэта эфектыўны і эканомны па кошце сродак без хлору, які добра адбеліць гардзіны.

**4.** Для таго, каб цюль пасля мыцця моцна не пакамячыўся, складзіце яго некалькі разоў да памеру невялікага прамавугольніка і пакладзіце ў спецыяльны мяшок для мыцця ў пральнай машыне.

**5.** Каб гардзіны набылі беласнежны колер, старанна прапалашчыце іх і апусціце ў халодную салёную ваду з 2-3 кроплямі зялёнкі. Салёная вада надасць неабходную жорсткасць, а зялёнка — беласнежнасць.

Пасля мыцця закруціце гардзіны ў прасціну, злёгку адцісніце і вільготнымі павесьце на карніз: выглядаць будуць як новыя.

■ Фотаздымак з гісторыяй

# АБАРОНЦА СТАЛІНГРАДА

**Паважаныя звяздоўцы! Дакладваю, што я трыццаць другі раз падпісаўся на «Звязду». Чаму? Па-першае, таму што гэта беларускамоўная газета. Па-другое, як аматар гісторыі і сын ветэрана вайны, знаходжу публікацыі раней невядомых фактаў, асабліва звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Акрамя таго, мяне захапіў конкурс «Фотаздымак з гісторыяй». На гэты раз хачу распавесці пра малодшага брата майго дзядулі Канстанціна Канстанцінавіча Тукая, ураджэнца вёскі Дубава Баранавіцкага раёна, 1900 года нараджэння. У 1918-м ён добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію, а пасля Грамадзянскай вайны служыў у ёй. Спачатку скончыў школу чырвоных камандзіраў, а ў 1934 годзе — Ваенную акадэмію імя Міхаіла Фрунзэ. Хутка, у званні маёра, атрымаў прызначэнне на пасаду камандзіра палка, які перад вайной размяшчаўся ў Вільнюсе.**

**За два дні да пачатку вайны адбыў у камандзіроўку па маладое воінскае папаўненне, пакінуўшы дома жонку Надзею Іванаўну, дванаццацігадовую дачку Алену і трохгадовага сына Жэню.**

У Вільнюсе ў першыя дні вайны, як і ў многіх гарадах Савецкага Саюза, панавала ўсеагульная паніка і неразбярыха, але пра сем'і камсастава не забыліся — падалі эшалоны для эвакуацыі ў тыл. Для падвозу людзей на вакзал камандаванне часці арганізавала падводы, звярнуўшыся з просьбай аб дапамозе да мясцовых жыхароў. Пад'ехала падвода і да Надзеі Іванаўны. Але, нагрузіўшы яе нехітрыя пажыткі, вознік даставіў сваіх пасажыраў не на вакзал, а за горад. Хоць перад ім была перапалоханая і безабаронная жанчына з малымі дзецьмі, вознік паскідаў усе рэчы з воза і паехаў, папярэдзіўшы, каб не лямантавала, а не то будзе дрэнна. Паколькі Літва была нядаўна ўключана без згоды народа ў склад СССР, мясцовае насельніцтва скоса паглядала на рускіх, лічыла іх акупантамі, і на дапамогу разлічваць было цяжка.

Што было рабіць Надзеі Іванаўне, ураджэнцы Адэсы, з двума малалетнімі дзецьмі на чужыне, удалечыні ад Радзімы? І яна ўспомніла, што ў адной з вёсак пад Баранавічамі пражывае стрыечны брат мужа. Праўда, бачыцца з ім ніколі не даводзілася, таму што Заходняя Беларусь да 1939 года знаходзілася ў складзе Польшчы, але гэта быў адзіны варыянт вырашэння паўсталай праблемы.

Узяўшы толькі дакументы і самыя неабходныя рэчы, Надзея Іванаўна з Жэнем на руках (Лена ішла сама), вырашыла прабірацца да Баранавіч. Як яны адолелі гэтыя дзвесце кіламетраў, гэта асобная гісторыя. Але дзякуючы падтрымцы добрых людзей, якія не былі абыякавымі да чужога гора, якія давалі прытулак, дзяліліся апошнім кавалкам хлеба, праз тыдзень, бежанцы дайшлі да вёскі Дубава. Адшукалі патрэбны дом, пастукалі. Ануфрэй Канстанцінавіч гасцінна прыняў сям'ю брата. Як не прынясць, калі вакол было столькі людскога гора. Разам з тым, гэта была для гаспадара вялікая рызыка. Але да гонару жыхароў вёскі Дубава, ніхто немецкім уладам не даклаў, што Ануфрэй Тукай даў прытулак сям'і камандзіра Чырвонай Арміі.

А Канстанцін Канстанцінавіч вельмі спадзяваўся, што яго Надзеі Іванаўне ўдалося эвакуявацца ў тыл. Знаходзячыся на фронце, ён доўга шукаў іх, але безвынікова. Знайшоў толькі сваю пляменніцу, маю маму, якая разам з маёй бабуляй знаходзіліся ў эвакуацыі ў Мардовіі.

А Канстанціна Канстанцінавіча ваенныя дарогі завялі пад Сталінград, дзе ён са сваім палком прыняў удзел у самай грандыёзнай бітве Вялікай Айчыннай вайны. Там, у горадзе над Волгай, ён і злажыў сваю галаву 17 жніўня 1942 года.



Пахаваны малодшы брат майго дзядулі на Мамаевым кургане. На гранітнай стэле сярод мноства прозвішчаў загінулых абаронцаў горада (другая калонка, трэці радок знізу) высечана і яго імя — маёр Тукай Канстанцін Канстанцінавіч.

**Іван ЛЫЧКОЎСКІ.**

*г. Баранавічы.*

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

■ У бацькоўскі нататнік

# 10 ПАРАД ДЛЯ МАТУЛЯЎ ХЛОПЧЫКАЎ

**Хлопчыкі, зрэшты, як і дзяўчынкі, не вырастаюць самі па сабе. Вы запіхваеце ў ваша дзіця карысную ежу, забяспечваеце яго чыстым адзеннем — і ў адзін цудоўны дзень ваш сын прачынаецца сапраўдным мужчынам? Не бывае такога!**

**1. Навучыце свайго сына выказваць словамі тое, што ён адчувае.**

Малеча можа крычаць ад роспачы, хавацца ад збянтэжанасці, кусацца ад хвалявання і плакаць ад страху. Растлумачце яму, што гэта эмоцыі, якія дыктуюць целу, як сябе паводзіць. Пакажыце яму іншых людзей, якія адчуваюць тое ж самае, але выказваюць свае эмоцыі па-іншаму. Абмяркоўвайце з дзіцем свае ўласныя пачуцці. Калі ён аднойчы вырасце, то будзе ведаць розніцу паміж злосцю і збянтэжанасцю, расчараваннем і горам, навучыцца спраўляцца са сваімі эмоцыямі і выказваць іх правільна, пры гэтым не саромеючыся і без пачуцця віны.

**2. Навучыце сына прыбіраць за сабой, гатаваць, мыць шкарпэткі і прасаваць кашулі.**

Магчыма, нешта з гэтага яму ніколі не спатрэбіцца, але яго жонка будзе вам удзячная.

**3. Пераканайцеся, што перад ім ёсць прыклады добрых людзей — разумных, смелых, моцных, таленавітых і сумленных.**

Распавядайце яму пра вялікіх пісьменнікаў, падарожнікаў, даследчыкаў, навукоўцаў, мастакоў, касманаўтаў, артыстаў. Пра тое, як яны жылі і чаго ім каштавала дасягнуць поспеху. Не толькі пра мужчын, але і пра жанчын. І пра тое, што ўнутраная прыгажосць часцяком важнейшая за вонкавую.

**4. Навучыце сына добрым манерам:** казаць «дзякуй» і «калі ласка», падаваць руку жанчынам, прапаноўваць дапамогу, саступаць месца. Гэта зробіць свет вакол крыху лепшым.



**5. Навучыце яго, што часам трэба быць вельмі далікатным** — да маленькіх дзяцей, жывёл, кветак і пачуццяў іншых людзей.

**6. Дайце яму магчымасць сапсаваць тую колькасць рэчаў, якую ён усё роўна сапсуе.**

Калі вы будзеце хвалявацца кожны раз, калі ваш хлопчык прыйдзе дадому ў брудным і рваным адзенні — вы распачняце безнадзейную барацьбу. Не марнуйце энергію на злосць перад непазбежнасцю — хлопчыкі пазнаюць свет, лазячы па дрэвах і платах, скачучы ў лужыны, разліваючы і падаючы. Гэта звычайныя рэчы. Лепш дайце яму штонебудзь, каб вызваліць энергію — барабаны, баксёрскую грушу, адкрытую прастору, ваду або сабаку.

**7. Цікаўцеся яго інтарэсамі** — даведайцеся ўсе тонкасці футбола і вывучыце імёны футбалістаў любімай каманды, развучыце ўсе песні любімага гурта ці назвы розных рухавікоў, зразумейце розніцу паміж Грыфіндорам і Слізэрынам або навучыцеся маляваць пандаў... Будзьце актыўным удзельнікам яго жыцця, а не назіральнікам.

**8. Дазвольце яму прайграць.**

Як бы ні хацелася, ваша дзіця не зможа быць пераможцам заўсёды. Вы кажаце яму: «Ты пераможца, таму што стараўся», але ён зусім не думае так і адчувае сябе расчараваным. І гэта добра, таму што часам жыццё выдае такія павароты, ад якіх мы ўсімі сіламі спрабуем зберагчы нашых дзяцей. Але гэтая практыка спатрэбіцца яму пазней, калі ён прайграе зноў (і зноў, і зноў, і зноў, і зноў...). Навучыце яго таму, што часам ён выйграе, а часам прайграе. Але гэта не азначае, што трэба здавацца.

**9. Растлумачце яму, што дасягнуць дасканаласці дапамагае практыка.**

Гэта датычыцца не толькі спорту або музыкі, але і ўсяго ў жыцці. Выпрацоўвайце правільныя звычкі, якія дапамогуць ужо даросламу мужчыну з лёгкасцю спраўляцца з любымі цяжкасцямі.

**10. Пабудуйце яму крэпасць.**

Кіньце на падлогу падушкі, падсуньце адзін да аднаго крэслы, накіньце на іх дзве коўдры, і дзіцячы пакой ператворыцца ў пячору цудаў. Гэта важныя веды пра тое, што кожная звычайная рэч мае ўнутраны патэнцыял, каб стаць чароўнай.

**Падрыхтавала Наталля ФІЛІМОНАВА**

■ Бабуля, пачытай!

# ЧАРОЎНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА

Даўно гэта здарылася, вельмі даўно, тады, калі ўсё навокал было шэрае: трава і кветкі, дрэвы і птушкі, ягады і грыбы. Нават неба навісала над зямлёй вялізнымі шэрымі хмарамі. А сонейка нібы сышло — назусім.

Так зрабіў злы чараўнік, які час ад часу зыркаў з-за шэрых хмар сваімі страшнымі вачыма і жудасна ляскатаў.

— Трэба пазбавіцца ад гэных чар, — сказаў сваім сябрам маленькі Максімка, які хораша граў на дудачцы.

— Пустая задума, — не падтрымала яго Аленка. — Што мы можам зрабіць гэтаму чарадзею?

— А вось паслухайце, — не здаваўся Максім, — як толькі блісне маланка, я зайграю на дудачцы, ты Аленка — на скрыпачцы, ты, Алеська — на гуслях. Упэўнены: разам мы адолеем чорную сілу!

Толькі ён гэтак прамовіў, як з шэрага неба пасыпаліся калючыя кроплі дажджу, успыхнула маланка і грымнуў гром.

Дзеці сталі іграць: гэта значыць, заплакала скрыпка, заспявалі гуслі, загудзела дудачка...

Ды не спужаўся іх злы чараўнік: яшчэ гучней заляскатаў гром, заблiскала маланка...

Але што гэта? Пачуўшы чароўныя гукі, палагаднеў трохі дождж, супакоіўся крыху пярун. А нарэшце, расхінуўшы шэрыя хмары, на зямлю выглянуў маленькі залацісты праменьчык, потым — другі, трэці,



чацвёрты... Кропелькі дажджу пад промнямі сонца зазіхацелі як каляровы масточак.

— Вясёлка! Глядзіце, вясёлка! — радасна закрычалі дзеці.

І яшчэ весялей заспявалі гуслі, яшчэ пяшчотней заплакала скрыпка, яскравей зайграла дудачка.

— Мы перамаглі! Мы прагналі злога чараўніка! — радаваўся Максімка.

Аксамітныя кропелькі дажджу бліскалі на зялёнай траўцы, на лісточках дрэў, на кветачках.

Не верачы сваім вачам, на вуліцу сталі выходзіць людзі. Яны ўсміхаліся і абдымалі адзін аднаго. Шчабяталі птушкі. Спявалі гуслі. Плакала скрыпка. Гудзела дудка. Вось што можа зрабіць чароўная сіла мастацтва! Запомні гэта, мой маленькі сябра.

**Лёля БАГДАНОВІЧ.**

*г. Барысаў.*

■ Пясочніца

**Коля (3 гады) вярнуўся з дзіцячага садка:**

**— Калі мы з Севам вырасцем, пойдзем у армію. А хто нас будзе з арміі забіраць?**

* * *

Віка (4 гады) распакоўвае пакупкі, што мы набылі для таты, дастае шампунь, пену для галення, антыперспірант: «Гэта для валасоў на галаве, гэта для валасоў на барадзе, а гэта для валасоў пад плячыма».

* * *

**Дзіма ўскарабкаўся на высокае крэсла. Прашу яго:**

**— Хутка свята, давай у доме прыбірацца, цацкі з падлогі пазбіраем...**

**— Я заняты. Я ж тут сяджу, нікому не замінаю.**

* * *

— Дзіма, а можа ты ў магазін сходзіш?

— Я адзін не пайду. Я ж не магу сам сябе ў карзінцы катаць.

* * *

**Да бабулі на канікулы з'ехаліся малыя. Унучак ціхі, маўклівы... У адрозненне ад унучкі... Галасок у той, што званочак, — звініць не сціхаючы.**

**— Памаўчала б ты хоць крыху, — не вытрымлівае неяк Рома.**

**— Ты думаеш, гэта лёгка? — тут жа пытае ў яго дзяўчынка.**

* * *

Чатырохгадовая Каця палуднуе з дзедам. Ядуць суп навыперадкі: унучка, ва ўсякім разе, вельмі спяшаецца, каб нарэшце радасна заявіць:

— Дзед, я цябе аб'ела!

* * *

**Маці штосьці прынесла з гаспадарчай крамы.**

**— Што гэта? — пытаецца сын, разгарнуўшы паперу.**

**— Гаспадарчае мыла.**

**Хлопчык з недаверам паглядзеў на маці, панюхаў мыла і, зморшчыўшы нос, паправіў:**

**— Яно туалетнае...**

* * *

Чатырохгадовы Рома лашчыцца да бацькі. Маці, седзячы побач, падахвочвае:

— Ну пацалуй жа татку, сынок.

— Не буду, — здымаючы ручкі з бацькавай шыі, адказвае той. — Ён жа не жанчына...

**Ганна ТРОШЫНА з Мінска,**
**Дзіна ДУБАДЗЕЛАВА з в. Леніна Добрушскага раёна.**

*«ДЗЕЦІ — УСМЕШКА БОЖАЯ». УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

# НА ЎЗРОЎНІ ЧАТЫРОХ «ЗОРАК»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хоць аб'ект і заяўлены як рэканструкцыя, насамрэч гэта, хутчэй, перабудова з намаганнямі пакінуць некранутым як мага больш з мінулага.

*— Мы хацелі захаваць адметнасці архітэктуры 30-х гадоў, уласцівыя гэтай часткі Беларусі, але стан будынка быў вельмі кепскі, аднавіць яго проста фізічна было немагчыма,* — адзначае Дзмітрый Мірон. — *1,5 месяца мы толькі разбіралі сцены, амаль уручную, па адной цаглінцы, бо існавала пагроза, што будынак «ляжа» на хату, што стаяла амаль упрытык да ваенкамата. Цэгла ўжо настолькі папсавалася, што была непрыдатнай для другаснага карыстання. Тым не менш што маглі, мы пакінулі некранутым, хоць гэта і даражэй, чым калі б мы проста зруйнавалі будынак і ўзялі зусім новы аб'ект.*

**У кожным нумары размесцяць партрэты айчынных культурных дзеячаў. Апроч Якуба Коласа і Янкі Купалы, Яна Баршчэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і іншых.**

Сцены гасцініцы «Беласток» узводзілі на падвальным падмурку, якога на старым месцы засталося каля 30%. Астатнюю частку пашырылі ў памерах і перанеслі далей ад суседскага жылля. Некранутым засталося таксама адно з памяшканняў падвала — тут будзе VIP-пакой з антуражам сакрэтнага месца-схованкі кантрабандыстаў 30-х гадоў. Гістарычныя цагляныя сцены пакрыюць толькі празрыстым лакам, застанецца плеценая праводка, у цэнтры размесціцца стол з зялёным абрусам. Аднавілі ў будучай гасцініцы і ляпніну — крыжыкі і квадрацікі, — што была пад казырком будынка ваенкамата.

*— Усе мае супрацоўнікі — гэта «эксклюзіў», аднак ёсць два асаблівыя чалавекі, якія вечна ўсім незадаволеныя. Яны, пакуль не будзе бездакорна, не адступяцца,* — смяецца дырэктар. — *Я часам здзіўляюся іх цярпенню і карпатлівасці. Валера над гэтай ляпнінай сядзеў пад страхой некалькі тыдняў і па чатыры крыжыкі на дзень рабіў. Затое цяпер усё выглядае дакладна, як і было. Лесвіцы ў гасцініцы таксама асаблівыя — паўкругам. Кожная зроблена ўручную.*

## БАСАНОЖ ПА ТРАВЕ ЗА СУСЕДСКІМІ ВІШНЯМІ

Нясвіжскі прадпрымальнік упэўнены, што рэгіёны трэба развіваць і выводзіць на новы ўзровень, таму аднолены будынак стане шматфункцыянальным культурна-гасцінічным комплексам, арыентаваным на шырокую публіку.

*— Нам ёсць што паказаць іншаземцам у Беларусі, аднак пры гэтым не павінна быць сорамна за тое, куды селім гасцей,* — лічыць Дзмітрый Мірон.

Гаспадар гатэля адзначае, што арганізуе ўсё на ўзроўні не менш за чатыры «зоркі». Абслуговы персанал кухні і рэсэпшэна — усе як адзін валодаюць англійскай мовай.

У гасцініцы абяцаюць наяўнасць адэкватных цэн і адсутнасць фэйс-кантролю. Тым не менш ахова будзе сачыць, каб у рэстаран не трапіла публіка ў шортах ці спартыўных штанах.

Каб госці маглі дакрануцца да розных духоўных каштоўнасцяў, у памяшканні гасцініцы побач з рэстаранам і клубнай зонай «прапішацца» прадзюсарскі цэнтр пад кіраўніцтвам **саліста групы «Дразды» Віталя КАРПАНАВА,** які адначасова з'яўляецца саўладальнікам гатэля.

*— З дапамогай нашага цэнтра мы будзем узнаўляць культурную гісторыю Нясвіжа і яго традыцыі. Арганізоўваць конкурсы маладых выканаўцаў, каб таленты не канцэнтраваліся толькі ў Мінску, не ехалі ў Піцер,* — падзяліўся планамі спявак. — *У нас музыкі знойдуць якасную стартавую пляцоўку. Напрыклад, акустыку робіць прафесійны гукарэжысёр, які потым і будзе тут працаваць.*

Раз на тыдзень у гасцініцы будзе выступаць з праграмай аматарскі мясцовы тэатр, плануецца праводзіць і іншыя тэматычныя вечарыны. А ў кожным нумары размесцяць партрэты айчынных культурных дзеячаў. Апроч Якуба Коласа і Янкі Купалы, Яна Баршчэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і іншых.

Шмат момантаў абслугоўвання Дзмітрый пераняў са сваіх вандровак па Еўропе і збіраецца рэалізаваць іх у трохпавярховым будынку гасцініцы, дзе размесціцца 21 нумар. Тут будуць не толькі звычайныя пакоі, але і два двухпавярховыя VIP, асобныя выхады з якіх павядуць у камерны тэнісны зал. На першым паверсе размесціцца нумар, зручны для пражывання інвалідаў, — да яго можна будзе дабрацца на спецыяльным пад'ёмніку з боку тэрасы.

Сучасны падыход рэалізуюць і ў афармленні падворку гасцініцы. Дзверы адной са сцен (цалкам зашклёнай) будуць весці на тэрасу.



У будынку, які рэстаўруецца, цяпер ідуць унутраныя работы.



Адрэстаўрыраваны і старажытны выгляд фасада ваенкамату.

Госцю, які пажадае папіць кавы або проста пасядзець на свежым паветры, прапануюць утульны плед.

**«Цэгла ўжо настолькі папсавалася, што была непрыдатнай для другаснага карыстання. Тым не менш што маглі, мы пакінулі некранутым, хоць гэта і даражэй».**

На, здавалася б, невялічкай тэрыторыі вакол гасцініцы ўладкуюць паркоўку для машын пастаяльцаў і экскурсійных аўтобусаў і нават міні-кафэ на адкрытым паветры. Апошняе — гэта чавернэ, якое выглядае як вялізная печ-шашлычніца або стыльны грыль, дзе пры вас згатуюць пэўныя стравы.

Шмат месца адведзена пад зялёную зону з альтанкамі, да якіх будуць весці дзве дарожкі. Па міні-парку, засаджанаму рабінамі, чырвонымі клёнамі, кустамі бэзу і язміну, з расстаўленымі там-сям лаўкамі, прапануецца гуляць проста па траве. Яе збіраюцца даглядаць так, каб зручна было прайсціся і басанож. Асобнае месца вылучаць і для выгулу чатырохлапых сяброў, засяляцца з якімі ў гасцініцу таксама дазваляецца.

Па перыметры тэрыторыя абнесена полікарбанатнай агароджай: яна празрыстая і не прапускае шум. Гэта зручна перш за ўсё для найбліжэйшых суседзяў гасцініцы — жыхароў звычайных аднапавярховых хат. Агароджа не забірае сонечнага святла і затрымлівае гукі. Увесну ўздоўж яе з'явяцца туі.

*— Пакуль ладзілі агароджу, убачылі, што суседскія вішні растуць на тэрыторыі гасцініцы. Каб не сячы дрэвы, пакінулі мясцовым кавалак нашай зямлі і адсунулі плот. Затое ўвесну ягады будуць звісаць на абодва бакі і імі змогуць ласавацца і суседзі, і нашы пастаяльцы,* — смяецца дырэктар.

## ЭКСКУРСІІ Ў МІНУЛАЕ

Дзмітрый Мірон марыць зрабіць Нясвіж і сваю гасцініцу своеасаблівым пунктам адліку, з якога іншаземцы змогуць пачынаць культурныя экскурсіі па заходняй частцы Беларусі.

*— Мы зацікаўлены, каб людзі затрымліваліся ў нас надоўга, а не прыязджалі толькі на дзень-два: паглядзець замак — і дахаты. Мы хочам прапанаваць ім насычаную і цікавую праграму, ад якой яны не змогуць адмовіцца,* — падзяліўся планамі прадпрымальнік. — *Думаю, палякам, напрыклад, спадабаецца своеасаблівы атракцыён-шоу. У холе ўсталюем грашовыя аўтаматы, дзе сучасныя купюры можна будзе абмяняць на сапраўдныя гістарычныя папяровыя і металічныя злотыя, што былі ва ўжытку да 1939 года. Імі можна будзе разлічвацца. Шмат хто з замежнікаў прыязджае ў Беларусь наведаць магілы продкаў і пабываць у мясцінах, дзе яны жылі. Мы гатовыя прапанаваць і такія выезды.*

Дзмітрый не выключае магчымасці нават невялікай рэканструкцыі мінулага. Турыстаў, якія будуць рухацца ў бок былой мяжы з Польшчай (у напрамку Стоўбцаў, Рубяжэвічаў), сустрэнуць акцёры ў форме супрацоўнікаў НКУС і Корпуса аховы пагранічча, якія правераць пашпарты.

Нясвіжскі энтузіяст марыць таксама пра стварэнне коннай школы як дадатковага адпачынку для пастаяльцаў і занятку для мясцовых дзяцей, каб яны вучыліся даглядаць жывёл. Такое памкненне — жаданне ажыццявіць сваю дзіцячую мару. У роднай вёсцы Слабодка, што ў Стаўбцоўскім раёне каля самай Налібокскай пушчы, ён разам са стрыечным братам цішком бегаў на стайню. Малыя падабралі ключ, кармілі коней. Каталіся верхам і марылі пра ўласных скакуноў.

Урачыстае адкрыццё гасцініцы летам плануецца прымеркаваць да першага культурнага форуму-фэсту. Такім чынам уладальнікі збіраюцца заявіць, што іх гатэль — гэта месца, дзе можна не толькі пераначаваць і смачна паесці, а і духоўна ўзбагаціцца.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

**Фота аўтара і з архіва Дзмітрыя МІРОНА.**



Партрэты культурных дзеячаў на сцены нумароў ужо падрыхтаваны. Іх напісанне спецыяльна заказвалі мастаку.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## «БЛІНАБОРСТВА» Ў ПЫШКАХ

**У суботу, 27 лютага, у гродзенскім лесапарку Пышкі адбудзецца культурна-спартыўнае свята «Насустрач вясне», адна з «фішак» якога — «Блінаборства».**

Спаборніцтва будзе праходзіць у два этапы. Першы — масавы забег удзельнікаў, якія падалі заяўку на афіцыйным сайце blinobor.by альбо па тэлефонах: 8 (029) 956-23-42, 8 (033) 382-80-96. Арганізатары склалі спецыяльны маршрут, які дапаможа «нагуляць» апетыт. Пасля чаго пяцёра лепшых бегуноў выйдуць у фінальны этап — паяданне бліноў на хуткасць. Пераможца «Блінаборства» атрымае галоўны прыз — 5 мільёнаў. А за забаўляльную частку на галоўнай сцэне свята будуць адказваць спявак Саша Нема, тэатр гумару «Канкан» і многія іншыя.

Барыс **ПРАКОПЧЫК.**

## ВОСЬ ГЭТА ЎЗБРОІЎСЯ!

**Супрацоўнікамі Кастрычніцкага РУУС сталіцы падчас аператыўна-прафілактычных мерапрыемстваў па спыненні незаконнай рэалізацыі пнеўматычнай і кідальнай зброі быў праведзены маніторынг сеціва, калі вывучаліся аб'явы на розных сайтах. У выніку ў мінчаніна канфіскавалі цэлы арсенал зброі і боепрыпасаў.**

У поле зроку міліцыянераў трапіла аб'ява аб продажы пнеўматычнай зброі. Пры сустрэчы з мужчынам высветлілася, што ў яго ў кватэры па вуліцы Асаналіева знаходзіцца цэлы арсенал рознай зброі: рэвальвер 1923 года выпуску, пісталет «Маўзэр», вінтоўка Мосіна калібру 7,62 міліметра, два пнеўматычныя аўтаматы АКС-74, два пнеўматычныя пісталеты, дзве пнеўматычныя вінтоўкі, паляўнічы карабін без ствала з затворам, ствол ад вінтоўкі часоў Вялікай Айчыннай вайны і 49 баявых патронаў калібру 7,62 міліметра.

Як паведамляе Кастрычніцкі РУУС г. Мінска, прызначана крыміналістычная экспертыза на прадмет прыдатнасці і спраўнасці канфіскаванай зброі і боепрыпасаў. За незаконнае захоўванне зброі і боепрыпасаў, згодна з артыкулам 295 («Незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў») Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, уладальніку арсенала можа пагражаць да 12 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Сяргей **РАСОЛЬКА.**

## У КОБРЫНЕ ЛІКВІДАВАНА НАРКАЛАБАРАТОРЫЯ

**Непрацуючы 33-гадовы жыхар Кобрына ў сваёй кватэры абсталяваў лабараторыю, дзе вырабляў небяспечнае псіхатропнае рэчыва — амфетамін. Гаспадара кватэры затрымалі супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і папярэджанні гандлю людзьмі Брэсцкага абласнога УУС.**

Як паведаміў **начальнік упраўлення Аляксандр МЕЛЬНІК,** з пачатку гэтага года супрацоўнікі ўпраўлення канфіскавалі больш за 2 кілаграмы наркатычных рэчываў. А ў момант затрымання кабрынчаніна пры ім было знойдзена больш за 10 грамаў наркотыку. Заведзена крымінальная справа. Зламысніку пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Святлана **ЯСКЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ
## ОАО «Испытания и сертификация бытовой и промышленной продукции «БЕЛЛИС»,
**г. Минск, ул. Красная, 7Б**

1. Дата собрания: **30.03.2016.**
